КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 45 (1380)
10 ЛІСТАПАДА 2018 г.

Кадр з фільма-пераможцы.

Увайсці ў гісторыю не як варвар

Чжаа Таа ("Попел беласнежны").

Назва яго стужкі — правакатыўная і інтрыгоўная. Але гэтым разам яна не спрацавала. Румынскі рэжысёр Раду Жудэ, аўтар фільма "Мне пляваць, калі мы ўвойдзем у гісторыю як варвары", насамрэч увойдзе ў гісторыю, усё ж, у іншай іпастасі — як уладальнік Гран-пры юбілейнага XXV Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад".
Ды і сам "Лістапад" у гісторыю фестывальнага кінаруху ўвайшоў даўно і зусім не па-варварску: амаль усе замежныя госці сёлетняга фестывалю адзначалі яго рэспектабельнасць, добрую рэпутацыю і дыхтоўны падыход да праграмы, у асноўны іграві конкурс якой адбіраюць кіно краін былога сацлагеру.

Вераніка МОЛАКАВА

Сцяпан Дзявонін ("Сэрца свету").

У гэтым годзе найлепшым рэжысёрам конкурсу названы Цзя Чжан-Кэ за фільм "Попел беласнежны". У кітайскай актрысы Чжаа Таа, якая сыграла ў гэтым фільме — найлепшая жаночая роля. Найлепшай мужчынскай роляй прызнана работа Сцяпана Дзявоніна ў фільме Наталлі Мешчанінавай "Сэрца свету". Прыз за найлепшы сцэнарый да фільма "Груз" атрымаў сербскі рэжысёр Огнен Главоніч. Аператарская работа Адама Баерскага і Томаша Рафы ў польскай стужцы "Аднойчы ў лістападзе" адзначана прызам імя Юрыя Марухіна. Украінскі кампазітар Антон Байбакаў уганараваны прызам за найлепшае гукавое (музычнае) рашэнне фільма Рамана Бандарчука "Вулкан". Спецыяльны прыз журы прысудзіла карціне "Трэцяя жонка" в'етнамскай рэжысёрскі Аш Мэйфэр.

Заканчэнне — **на старонцы 3.**

Соцыум

КАЛІ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА...

Нярэдка, калі творца сам у час не падбае, каб ягоныя работы патрапілі ў добрыя рукі, спадкаемцы ў дадатак да пачуцця страты блізкага атрымліваюць пажыццёвы клопат, куды падзець гэтае багацце. "К" разважае пра праблемы захавання спадчыны мастакоў.

ст. 4 — 5

Суботнія сустрэчы

ГРОДЗЕНСКІ БАЛКОН СІЛЬВАНОВІЧАЎ

Пра жыццё галерэй у рэгіёнах "К" пагутарыла з жывапісцам Аляксандрам Сільвановічам і яго жонкай — дырэктарам Гродзенскай выставачнай залы Ірынай Сільвановіч.

ст. 6

Prof-партфоліа

ЁСЦЬ ДАВЕР, НЯМА АДЛЕГЛАСЦІ

На наступным тыдні ў Камерным драматычным тэатры прэм'ера ў пакуль рэдкім у Беларусі імерсіўным жанры. Як зрабіць так, каб глядач адчуваў, што яго дзеянні змяняюць спектакль, распавяла "К" рэжысёр Наталля Башава.

ст. 13

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Фота Генадзя ЖЫНКОВА, БелТА

5 лістапада ў прысутнасці кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай, міністра культуры Рэспублікі Беларусь Юрыя Бондара і іншых афіцыйных асоб быў адкрыты пасля рэканструкцыі будынак Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра на праспекце Машэрава.

Новая кропка на тэатральнай карце

Настасся ПАНКРАТАВА

Заснаваны ў 1984 годзе тэатр доўгі час не меў сваёй пляцоўкі, пакуль у 1987-м не атрымаў будынак былога кінатэатра "Спартак", дзе на той момант месціўся Дом культуры работнікаў гандлю. Яго памяшканні паступова адаптавалі пад патрэбы тэатра — там з'явілася гукавое і светлавое абсталяванне, грымёркі, касцюмерны цэх і гэтак далей. Але будынак патрабаваў грунтоўнага рамонту, і ў 2010 годзе яго закрылі на рэканструкцыю, таму маладзёжны тэатр працаваў на пляцоўках Палаца рэспублікі, Палаца прафсаюзаў ці ДК Чыгуначнікаў. Толькі ў 2014 годзе калектыў пераехаў у новы будынак на вуліцы Казлова, 17. Увесь гэты час праводзіліся будаўнічыя працы на Машэрава, 33. І вось на гэтым тыдні яны афіцыйна завяршыліся — цяпер там знаходзіцца Малая сцэна Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра.

Як паведаміла "К" намеснік генеральнага дырэктара ўстановы Алена Пяроўская, зараз у рэканструяваным будынку ідуць рэпетыцыі трох ужо добра вядомых гледачам спектакляў: трэба ўпісаць дэкарацыі ў новую сцэнічную пляцоўку, развесці мізансцэны, прынаравіцца да светлавога і гукавога абсталявання.

— На Малой сцэне 1 снежня мы пакажам праверaную і любімую публікай пастаноўку Міхаіла Кавальчыка "Піжама на шасцярых (згуляем у дружную сям'ю)" камедыёграфа Марка Камалецці, — кажа Алена Пяроўская. — 2 снежня чакаем гледачоў на "Варшаўскай мелодыі" Леаніда Зорына ў рэжысуры Мадэста Абрамава. Да навагодніх святаў робім падарунак юным мінчанам: 28 снежня пакажам "Старую чароўную казку" рэжысёра Канстанціна Міхаленкі. Сёлета гэты спектакль намініраваны на Нацыянальную тэатральную прэмію. Паралельна ў нашым асноўным будынку на Казлова, 17 будзе ісці ўвесь дзейны рэпертуар.

З 1 студзеня 2019 года Малую сцэну арэндуе Тэатр-студыя кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм". Хутка распачнецца рэканструкцыя кінатэатра "Масква", у будынку якога ў дадзены момант працуе калектыў, таму адкрыццё новай тэатральнай пляцоўкі на карце сталіцы прыйшлося як нельга дарэчы.

К

У гонар Песняра

2 лістапада 2018 года ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася XXXII навуковая канферэнцыя "Каласавіны — 2018", прысвечаная 100-годдзю першага выдання паэмы Якуба Коласа "Сымон-музыка" і 95-годдзю выхаду паэмы "Новая зямля".

Мерапрыемства распачала вучаніца СШ № 196 Соф'я Гаро, якая чытала вершы класіка. Канферэнцыю наведалі даследчыкі і ганаровыя госці не толькі з Беларусі, але і з Літвы, Польшчы, Расіі і іншых краін. Сярод іх — доктар гістарычных навук, прафесар Алесь Лакотка, пісьменнік, намеснік старшыні Беларускага Фонду культуры Анатоль Бутэвіч, паэт Навум Гальпяровіч, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Іван Саверчанка, старшыня беларускай суполкі "Крыніца" з Клайпеды Мікалай Логвін, намеснік старшыні Таварыства беларускай культурнай спадчыны Друскенікаў Ірына Мудрова, а таксама дырэктар літаратурна-мастацкага музея Анастасіі і Марыі Цвятаевых з горада Аляксандраў (Расія) Леў Готгельф.

На пленарным пасяджэнні выступілі намеснік дырэктара Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Яўген Гарадніцкі і загадчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры Сілезскага інстытута ў Катавіцах (Польшча) Эва Касоўская.

Тэмы дакладаў вылучаліся разнастайнасцю. У прыватнасці, даследчык Аляксей Ненадавец сканцэнтраваў сваю ўвагу на "Рыбалоўстве палешукоў у трылогіі Якуба Коласа "На ростанях", старшыня фонду духоўнага і культурнага адраджэння "Сакавік" Марыя Міцкевіч распавяла пра стасункі Коласа і братоў Луцкевічаў, а дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратур Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Таццяна Хоміч засяродзілася на інтэрпрэтацыі Адама Бабарэкі паэмы "Сымон-музыка".

Аляксей ШАЛАХОЎСКІ, гісторык культуры

Феерыя балетнага мадэрну

20 — 25 лістапада ўжо ў 31-ы раз пройдзе знакаміты IFMC — Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі. Асноўныя падзеі, вядома, разгарнуцца ў Віцебску. Але пачнецца форум, паводле традыцыі некалькіх апошніх гадоў, у сталіцы, на сцэне Вялікага тэатра Беларусі. І сёлета закране нават Гомель, радзіму яшчэ аднаго харэаграфічнага свята міжнароднага разгортку — "Сожскага карагода".

Надзея БУНЦЭВІЧ

У трох адзначаных гарадах Spellbound Contemporary Ballet пакажа "Уверцюры Расіні" ў харэаграфіі Маура Астолфі. Італьянскі "дансант" адбудзецца ў рамках сусветнага гастрольнага тура, што здзяйсняецца пры фінансавай падтрымцы нацыянальнага італьянскага камітэта, які аплачвае авіяперавозкі артыстаў і перавозку дэкарацый. Балет быў пастаўлены да 150-годдзя з дня смерці кампазітара, імя якога стала адным з мастацкіх брэндаў сваёй краіны.

Гэта далёка не адзіны гасцявы сюрпрыз фестывалю. Ажно тры свае новыя працы пакажа трупа "Балет Яўгена Панфілава" з Пярмі. Калектыў — равеснік IFMC, і сёлета спаўняецца 25 гадоў з часу яго першага прыезду на віцебскі форум. Менавіта дзякуючы Яўгену Панфілаву фестываль набыў у свой час цяперашні выгляд, распачаўшыся ў канцы 1980-х з аматарскага брэйку, які ў тыя савецкія часы здаваўся глытком свежага паветра.

Нельга прапусціць і чарговы двухактавы балет Раду Паклітару — яго ўласную версію "Спячай прыгажуні". Гэтая прэм'ера ўзнікла ў рэпертуары яго аўтарскага тэатра "Кіеў Мадэрн Балет" дзякуючы швейцарскаму гранту. І ўжо скарыла прыхільнікаў сучаснага танца на штогоднім летнім фестывалі ў Адэсе.

Як заўжды, будзе і перформанс у час адкрыцця фестывалю ў Віцебску, і разнастайныя выставачныя праекты, якія сёлета з'яднаюць пластыку не толькі з фотамастацтвам, але і са скульптурамі Андрэя Вараб'ёва.

Ды ўсё ж у цэнтры фестывальных падзей, безумоўна, апынецца конкурс — тым больш, што сёлета ён таксама міжнародны. На адборачны тур, які традыцыйна праходзіць на аснове дасланых відэазапісаў, паступіла амаль сотня заявак з больш як дзесяці краін. На конкурс прымаліся кампазіцыі працягласцю не больш за 20 хвілін, але сёлета, у адрозненне ад мінулых гадоў, значна пераважаюць менавіта буйныя формы. Наколькі яны ўразяць журы, даведаемся на ўрачыстым закрыцці фестывалю — увечары 25 лістапада.

К

Страта

Пад гукі габоя

Пайшоў з жыцця прафесар, доктар мастацтвазнаўства, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Барыс Нічкоў. Яшчэ пры жыцці яго імя стала ледзь не сінонімам выканальніцтва на драўляных духавых інструментах у нашай краіне.

Ён прысвяціў гэтаму ўсё сваё жыццё. Шмат гадоў загадваў адпаведнай кафедрай Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, а выкладаў на ёй — намнога больш. Абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі па гэтай тэме, выдаў некалькі манаграфій, прысвечаных развіццю беларускага прафесійнага духавога выканальніцтва — ад гістарычнай даўніны да сучаснасці. Зрэшты, ён не толькі даследаваў — ён сам развіваў гэтае выканальніцтва! І давёў яго да сапраўдных вяршыняў майстэрства.

Менавіта Нічкоў калісьці запрасіў у Беларусь легендарнага габаіста Аляксандра Прыходзьку. Заўважыў яго на конкурсе ў Калінінградзе яшчэ пачаткоўцам, разгледзеў талент — і ўзрасціў музыканта экстракласа. А праз яго і паскорыў развіццё нацыянальнай кампазітарскай школы! Ледзь не ўсе буйныя творы тых гадоў утрымліваюць габойныя сола. Музыказнаўцы нават бачылі ў гэтым праяўленне нацыянальнай слыхавой генетыкі: маўляў, габой імітаваў гукі беларускіх дудак ды жалеек. Можа, так яно і ёсць, бо толькі справакавана тое было з'яўленнем выбітнага саліста, у разліку на віртуознасць якога і з'яўлялася новая беларуская музыка, уключаючы шматлікія сольныя опусы.

З класа Барыса Нічкова выйшлі і многія іншыя сёння ўжо сусветна вядомыя музыканты. Гэта Святлана Сергіенка, якая ў свой час стала сенсацыяй Усесаюзнага конкурсу, дзе звычайна перамагалі выхаванцы Маскоўскай ды Ленінградскай кансерваторый, Юрый Лікін, Ігар Ляшчышын, Вікторыя Татур, Васіль Закапец, Іван Філіпаў і многія іншыя, якія працавалі і працуюць у вядучых калектывах нашай краіны і замежжа. Сярод выпускнікоў маэстра, дарэчы, ёсць не толькі габаісты, але і вядомая флейтыстка Таццяна Кармазінава. Сапраўды, ён настолькі добра ведаў прыроду ўсіх драўляных духавых, што мог бы выкладаць ігру і на іншых інструментах — не менш паспяхова за "вузкіх спецыялістаў".

Немагчыма пераацаніць ягоны ўнёсак у нашу нацыянальную культуру. Але ёсць яшчэ ўласна чалавечыя якасці, якія дапамагалі яму ў ягонай пачэснай справе. Ён ніколі не "ішоў па галовах". Ён настойліва, але надзвычай спакойна, у штодзённым працоўным рэжыме — і, заўважу, без аўралаў — рушыў да пастаўленых мэтаў. Пэўна, і цяпер працягвае ісці — дакладней, плысці-лунаць дзесьці ў завоблачным далячынні. Пад гукі габоя, якія ў многіх асацыююцца з лейтматывам "Лебядзінага возера" Чайкоўскага: ці то заклік лебедзяў, ці то развітальнае клекатанне журавоў, у якіх, баюць, ператвараюцца чалавечыя душы…

Надзея БУНЦЭВІЧ

К

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Ілья Васільевіч СВІРЫН; **намеснік галоўнага рэдактара** — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Іна НАРКЕВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **фотакарэспандэнт** — Сяргей ЖДАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Таццяна ПАШЭНЬКА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Мерканванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2018. Наклад 3 557. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 09.11.2018 у 20.00. Замова 4240.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Па выніках глядацкага галасавання на першым месцы апынулася драма “Юлі”.

Цырымоніі адкрыцця і закрыцця фестывалю праходзілі ў кінатэатры “Масква”.

Увайсці ў гісторыю не як варвар

Лізавета Бобрыкава — каардынатар Індустрыяльнай платформы — на пітчынгу на “Беларусьфільме”.

Начальнік упраўлення па кінематаграфіі Міністэрства культуры Аляксандр Рыдван з народнай артысткай РСФСР Святланай Немаляевай.

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

У конкурсе іграваога кіно “Маладосць на маршы” найлепшым фільмам конкурсу імя кінарэжысёра Віктара Турава названа бразільска-партугальская стужка “Мёртвыя і іншыя” Жаана Салавіса і Рэнэ Надэра Месора. Спецыяльны прыз журы ўручыла тайскаму рэжысёру Пхуціпхонгу Арунпхенгу за карціну “Манта рэй”. Дыпломам “За парушэнне чаканняў глядацкага ўспрымання, за высакароднасць рэжысуры, за вышуканы мантаж” адзначана стужка “Пакаёўка” мексіканскай рэжысёркі Лілы Авілес. Ёй дастаўся яшчэ і **прыз міжнароднага журы кінапрэсы FIPRESCI** “Новыя галасы”.

У асноўным конкурсе дакументальнага кіно Гран-пры атрымала карціна “Дамашнія гульні” ўкраінскай рэжысёркі Алісы Каваленка. Спецыяльны прыз журы — у стужкі “За мяжой” польскай рэжысёркі Марты Прус. Дыпломамі “За выдатныя дасягненні” ўганараваныя фільмы “Пустэльнік” расійскага рэжысёра Арцёма Маскалёва і “Нявольніца” венгерскай рэжысёркі Бернадэт Тузы-Рытэр.

У конкурсе маладога дакументальнага кіно — конкурсе нацыянальных кінашкол прыз за найлепшы фільм — у рэжысёра фільма “Той жа боль” Петэра Санда Магнусана з кінашколы ў Лодзі. Дыплом “За аператарскую работу і мужнасць” атрымаў Бягім Жалдубай Кызы з Кыргызска-Турэцкага ўніверсітэта “Манас”. “За дасціпны арыгінальны падыход” — Імэн Чжан і Мірна Эверхард “За тое, што кажаце жыццю “так”, усведамляючы яго хуткаплыннасць” з Мабільнай кінашколы DocNomads.

У Нацыянальным конкурсе найлепшым іграваым фільмам названа стужка “Дачка” Мары Тамковіч. Найлепшым дакументальным — “Песні для кіта” Руслана Фядотава. Найлепшым анімацыйным — “Лагодны воўк” Наталіі Дарвінай. Рэжысёр кінанавэлы “Франка” ў альманаху “Вайна. Застацца чалавекам” Мітрый Сямёнаў-Алейнікаў атрымаў дыплом “За выдатнае візуальнае рашэнне”. Аніматар Ігар Волчак за фільм “Ваўчышка” — “За вытанчанасць і паэтычнасць яго творчасці”.

“Залаты “Лістападзік” у конкурсе фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі прысуджаны кенійскай стужцы Лікарыёна Ванайны “Супа Мода”. Найлепшая дзіцячая роля — у тайскага артыста Шан-Хэ Хуана ў фільме “Ведае толькі мора”. Прыз за найлепшую работу дарослага акцёра ў дзіцячым фільме атрымаў Філіпа Ніграа (“Пабег у Рым”). Спецыяльны прыз за найлепшы сцэнарый журы ўручыла рэжысёру з Казахстана Алдзіяру Байракімаву (“На мяжы”). Дыпломам “За найлепшае аператарскае майстэрства” ганаравана рэжысёрка з Эстоніі Мооніка Сійметс.

Па выніках глядацкага галасавання перамагла іграваая стужка “Юлі” іспанца Ісіяра Бальяіна, і дакументальная “Праект “Бабуля” венгра Балінта Рэвеса. У конкурсе “Лістападзіка” публіка больш за ўсё ўпадабала вышэй згаданы фільм “Супа Мода”.

“Дамашія гульні”.

“Песні для кіта”.

“Дачка”.

“Супа Мода”.



“Лагодны воўк”.

Сербскі рэжысёр Огнен Главоніч.

Пераможца Нацыянальнага конкурсу Мара Тамковіч.

Рустам Сагдулаеў на цырымоніі адкрыцця.

Маленькі глядач пасля паказу аднаго з фільмаў “Лістападзіка”.

Фота Ганны ШАРКО

Калі засталася спадчына...

Летась пайшоў з жыцця Георгій Паплаўскі — творца, якога пры жыцці лічылі класікам. Ён належыць да кагорты мастакоў, якія ва ўжо далёкія 1960-я здзейснілі ў нашай культуры ментальную рэвалюцыю — вывелі беларускае выяўленчае мастацтва з замкнёнага кола этнаграфічна-вясковых традыцый у мадэрны свет, надалі яму дынамікі і крэатыву. Георгій Паплаўскі годна прадстаўляў Беларусь у кантэксце савецкай культуры — і Савецкі Саюз ва ўсім свеце. Гэта асоба з таго ж шэрагу, што і Міхаіл Савіцкі, Гаўрыіл Вашчанка, Леанід Шчамялёў. Адсюль і мая выснова: гэтак жа, як згаданыя творцы, Паплаўскі варты мемарыяльнай галерэі.
Як, напрыклад, і геніяльны пейзажыст Віталь Цвірка і папраўдзе касмічных маштабаў творца Аляксандр Кішчанка. Пра ўласныя музеі ці галерэі яны таксама ў свой час не парупіліся. Зрэшты, пагаворым пакуль пра Паплаўскага.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота аўтара

ПАДАРЫ, КАБ НЕ ПРАПАЛА

Захаванне творчай спадчыны мастакоў, якія пакінулі гэты свет — тэма няпростая, а часам і балючая. Звычайна атрымліваецца так, што калі творца сам пры жыцці не падбае, каб ягоныя работы патрапілі ў добрыя рукі — сталі ўласнасцю дзяржавы ці рупліўца-калекцыянера, спадкаемцы ў дадатак да пачуцця страты роднага чалавека атрымліваюць пажыццёвы клопат, куды падзець гэтае багацце. Бо гэта бы тая валізка без ручкі: і кінуць нельга, і цягнуць цяжка.

Гаўрыіл Вашчанка своечасова падарыў немалую калекцыю сваіх работ Гомелю, Леанід Шчамялёў — Мінску. Так утварыліся гарадскія галерэі іх імя. Творы Вашчанкі адразу размясцілі ў рэспектабельным будынку ў цэнтры горада, а вось галерэя Шчамялёва больш за дзесяць гадоў месцілася ў спальным раёне сталіцы, але ўрэшце таксама пераехала ў гістарычны цэнтр. Падарыў калекцыю сваіх твораў Магілёву Павел Масленікаў. Такім чынам у структуры абласнога мастацкага музея ўтварылася яго імянная галерэя. А цяпер і сам музей носіць імя Паўла Масленікава.

Падобны сцэнарый, як мне падаецца, мог бы здзейсніцца і ў выпадку з Георгіем Паплаўскім. У 2009 годзе на базе гарадской выставачнай залы Бабруйска быў створаны доўгачаканы мастацкі музей. І мастакоўская грамада горада выступіла з ініцыятывай надаць яму імя Георгія Паплаўскага. Рэч у тым, што хоць мастак і нарадзіўся на Украіне, падлеткавыя гады ён правёў менавіта ў гэтым горадзе, і менавіта ў тамтэйшай студыі выяўленчага мастацтва зрабіў першыя крокі на творчым шляху. Так што і Бабруйск для Паплаўскага родны, і для Бабруйска Георгій Георгіевіч не чужы. Жыхары горада падтрымалі ідэю надання музею імя знакамітага земляка, прыйшлася яна даспадобы і муніцыпальным уладам. Але...

ЗАЦІКАЎЛЕНЫЯ БАКІ НЕ ЗДОЛЕЛІ ДАМОВІЦЦА

Адным з ініцыятараў згаданай ідэі быў Валерый Калтыгін — выдатны мастак і проста аўтарытэтная асоба. Ён нават асабіста подпісы збіраў за рэалізацыю задумы. Сёння Валерый згадвае, што ўсё пачыналася добра: музею сапраўды далі імя Георгія Паплаўскага, шэраг сваіх твораў мэтр перадаў у яго фонды. А вось потым нешта пайшло не так. Прычым "аблом" быў такі, што нават само імя Паплаўскага выклікала ў тагачаснага бабруйскага начальства нервовую рэакцыю, і каб закрыць гэтую тэму, праз некалькі гадоў з афіцыйнай "шыльды" музея знялі імя мастака. Цяпер гэта проста музей. Праўда, многія па звычцы па-ранейшаму гавораць "музей Паплаўскага".

Чаму так здарылася? Паводле слоў спадара Валерыя, у нейкі момант узнікла непаразуменне паміж сям'ёю мастака і бабруйскімі ўладамі, якія мусілі зыходзіць з рэалій планавання гарадскога бюджэту і матэрыяльна-тэхнічнага ды кадравага патэнцыялу рэгіянальнага цэнтра.

Калтыгін удакладняе, што сам Паплаўскі ў тых разборках удзелу не браў. Мастак, засяроджаны на творчасці, мог нават і не ведаць, якія жарсці віравалі вакол "ягонага" музея. Зрэшты, гэта справа былая. Спадар Валерый лічыць, што калі сёння забыць узаемныя крыўды тае пары, дык музею ў перспектыве магчыма можна будзе вярнуць імя славутага земляка і стварыць на сваіх плошчах мемарыяльную галерэю Паплаўскага.

НАЙЛЕПШЫ МЕМАРЫЯЛ — МАЙСТЭРНЯ

Як на маю думку, амаль ідэальным месцам ушанавання памяці вялікага мастака і прасторай для разумення ягонай творчасці магла б стаць мемарыялізаваная майстэрня. Фактычна, гэта прасторавы аўтапартрэт мастака. У верасні 2016 года наша рэдакцыя была ў гасцях у мэтра. Мы тады ладзілі сумоўе паводле фармату "Рэдакцыя плюс". Мяркую, на тым сумоўі мы ўсе адчулі, што майстэрня для мастака — другі дом. А ў выпадку з Паплаўскім — нават першы. Яе інтэр'ер складаецца не толькі з творчага інструментарыя і работ на рознай стадыі завершанасці, але і з дарагіх гаспадару рэчаў, кніг на паліцах, фотаздымкаў на сценах.

Георгій Георгіевіч бываў у самых далёкіх закутках Савецкага Саюза, наведаў шмат якія краіны. І адсюль ён прывозіў рэчы, якія б зрабілі гонар сур'ёзнаму мастацкаму ці этнаграфічнаму музею. Такая адкрытасць творчай натуры свету, цікавасць да наваколля для многіх нашых людзей з "хутарской псіхалогіяй" не надта ўласцівая. Таму глядзі, госць, на калекцыю Паплаўскага, здзіўляйся — і ламай у сваёй свядомасці стэрэатыпы адносна беларускай ментальнасці.

Пагатоў, большасць гэтых рэчаў, наколькі я ведаю, дасюль захоўваецца ў майстэрні. Так што ў наяўнасці — гатовая музейная экспазіцыя, якая дае аб'ектыўнае ўяўленне пра шматгранную асобу мэтра беларускай графікі.

АЛЕ МАЙСТЭРНЯ — НЕ МУЗЕЙ

Ушанаванне памяці Георгія Паплаўскага праз мемарыялізацыю ягонай майстэрні, відаць, цалкам задаволіла б ягоную ўдаву Наталлю Мікалаеўну, на якой цяпер ляжыць клопат пра набыткі спачылага мужа. Старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца, які паводле службовага абавязку мае дачыненне да падобных праблем і па меры магчымасці спрыяе іх вырашэнню, ужо неаднойчы сутыкаўся з тым, што захаванне творчай спадчыны творцы — справа не менш складаная, чым уласна мастакоўская праца.

Ён лічыць, што ўсім вядомую вежу на Сурганава — калі хочаце, наш аналаг парыжскага Манпарнаса — можна мемарыялізаваць ад першага да апошняга паверха, як, зрэшты, і многія паддашкі ў іншых частках Мінска. Творчы саюз у дадзеным выпадку можа хіба паспрыяць таму, каб на будынку, дзе знаходзілася майстэрня выдатнага мастака, з'явілася мемарыяльная шыльда. А займацца лёсам творчай спадчыны давядзецца ўсё ж такі законным спадкаемцам-сваякам.

Добра, калі сын ці дачка памерлага таксама мастак, таксама сябра творчага саюза і ўжо мае заслугі, якія давалі б яму права заняць бацькаву майстэрню — і, адпаведна, парупіцца пра захаванне ягоных работ. Але пры хранічнай нястачы плошчаў куды больш верагодна, што яе зойме нехта чужы. І ён будзе пазбаўлены сентыментаў.

А ЯК ГЭТА РОБІЦЦА Ў ПАРЫЖЫ?

І праўда: як падобную праблему вырашаюць за мяжою, у тых краінах, культурная гісторыя якіх для нас — прадмет зайздрасці? Ды ніяк. Праз адсутнасць самой праблемы. Возьмем, да прыкладу, адзін з найвядомых музеяў Парыжа — "Гатэль Бірон", дзе месціцца самая вялікая калекцыя твораў Агюста Радэна. Гэты прыгожы будынак XVIII стагоддзя напрыканцы XIX стагоддзя збіраліся зруйнаваць, бо не ведалі, што з ім рабіць. Радэн жа папрасіў перадаць яму тую нерухомасць на правах уласнасці, каб ён мог зладзіць там сабе майстэрню. А наўзамен паабяцаў падарыць дзяржаве калекцыю сваіх работ. Так і дамовіліся. І будынак захаваўся, і Радэн прыстойную майстэрню займеў, і Парыж сёння мае яшчэ адну турыстычную цікавостку. Прасцей кажучы, Радэну было чым заплаціць за шыкоўную майстэрню, якая потым стала музеем.

Вялікі шведскі скульптар Карл Мілес быў дастаткова багатым, каб прыдбаць кавалак зямлі на ўскраіне Стакгольма, пабудаваць на ім дом і майстэрню, упрыгожыць прылеглую тэрыторыю сваімі скульптурамі. А завяшчаў ён ўсё гэта дзяржаве. Сёння так званы Сад Мілеса — адна са славутасцей Стакгольма і ўсёй Швецыі. Мяркую, Пікаса, Далі, Маціс, Шагал таксама не мелі клопату пра тое, што стане ў будучым з іхнімі творамі...

Свежы бохан ад Палевіка

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

У дырэктара Музея хлеба Ірыны Нікішовай булкі заўжды смачныя.

Музей хлеба, міфалагічны цэнтр і турыстычна-прывабныя Смілавічы. Пра гэтыя і многія іншыя культурныя праекты, падтрыманыя Еўрапейскім саюзам і Праграмай развіцця Арганізацыі Аб'яднаных нацый, гаварылі на "Кастрычніцкім эканамічным форуме", які днямі адбыўся ў Мінску.

"К" ужо неаднаразова пісала пра многія праекты ЕС/ПРААН, рэалізаваныя ў нашай краіне. Некаторыя з іх сталіся сапраўды знакавымі для сваіх рэгіёнаў, паспрыялі рэалізацыі мясцовых ініцыятыў і, без усякіх сумненняў, павялічылі прывабнасць нашай краіны як для мясцовых жыхароў, так і для замежных турыстаў.

Як адзначыў падчас "Кастрычніцкага эканамічнага форуму" старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы, член Савета Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіслаў Шчэпаў, удзельнічаючы ў праектах ПРААН, беларусы атрымалі магчымасць пераняць міжнародны досвед, які спатрэбіцца для рэалізацыі ўласных адметных праектаў.

— Мяркую, дзяржаўным прадпрыемствам, установам адукацыі і культуры сёння не варта абапірацца толькі на бюджэтнае фінансаванне, — зазначыў парламентарый. — Вялікі патэнцыял я бачу за дзяржаўна-прыватным партнёрствам, за рэалізацыяй малых праектаў, накіраваных на развіццё "зялёнай" эканомікі, сферы адукацыі, культуры і гэтак далей, асабліва ў сельскай мясцовасці. Далейшае супрацоўніцтва па гэтых пытаннях з Еўрапейскім саюзам і Праграмай развіцця ААН мае для Беларусі вялікія перспектывы.

У сваю чаргу, кіраўнік Прадстаўніцтва Еўрапейскага Саюза ў Рэспубліцы Беларусь Андрэа Віктарын адзначыла ў якасці прыкладу паспяховай рэалізацыі праектнай дзейнасці ініцыятывы ў Смілавічах. Як вядома, у рамках ініцыятывы там былі акультураны турыстычныя месцы, усталяваны ўказальнікі, выдадзены даведнікі для падарожнікаў на рускай, англійскай і французскай мовах, абноўлены музей "Прастора Хаіма Суціна", створана экспазіцыя ў "Музычнай гасцёўні Станіслава Манюшкі".

Да слова, за апошнія чатыры гады Еўрапейскім Саюзам было рэалізавана ў Беларусі 243 праекты ў самых розных сферах, на падтрымку гэтых ініцыятыў выдаткавана 3,6 мільёна еўра, створана 30 ініцыятыўных груп і 352 аб'екты інфраструктуры. Дзякуючы гэтаму, у соцень і нават тысяч беларусаў з'явіліся новыя магчымасці для адукацыі і самаадукацыі, культурнага развіцця, атрымання якасных сацыяльных і медыцынскіх паслуг у малых гарадах і сельскай мясцовасці.

Па словах пастаяннага прадстаўніка Праграмы развіцця ААН у Беларусі Іааны Казаны-Вішнявецкай, фінансаванне Еўрапейскага саюза і суправаджэнне развіцця мясцовых супольнас-

Наталля Паплаўская.

УЛАСНАСЦЬ ЛЕПЕЙ, ЧЫМ АРЭНДА

У нас, наколькі я ведаю, майстэрню, якая адразу ж стала музеем, меў толькі Заір Азгур. Дзяржава, беручы да ўвагі ягоныя заслугі, пабудавала карыфею сацыялістычнага рэалізму асабняк. Падобную раскошу зведаў і Андрэй Бембель, толькі ягоны дом-майстэрня на музей не пацягнуў. Цяпер там офіс Беларускага саюза мастакоў. Трохі больш сціплы, але таксама выдатны досвед — музеефікацыя муніцыпальнымі ўладамі Мінска дзейнай творчай майстэрні нашага жывога і поўнага творчых сіл класіка Івана Міско.

Зрэшты, гэта зусім не асабняк. Хаця некаторыя з мастакоў свае асабнякі маюць. Творчыя людзі, канешне ж, не супраць атрымаць у арэнду майстэрню ад дзяржавы, але сёй-той, калі дазваляе дастатак, укладае грошы ў нерухомасць. Маўляў, мая ўласная майстэрня — мая крэпасць. І падмурак матэрыяльнай незалежнасці заадно.

Толькі вось што будзе з гэтымі замкамі, калі іх уласнікі пераступяць тую мяжу, якую — хоцькі-няхоцькі — наканавана перайсці кожнаму?

ПРАМЕЖКАВЫ ВЫНІК

На пачатку года Наталля Паплаўская звярнулася ў Міністэрства культуры з просьбай вырашыць праблему творчай спадчыны свайго вялікага мужа. У лісце яна выказвае занепакоенасць тым, што без клопату з боку дзяржавы работы выдатнага майстра могуць быць страчаны для гісторыі. На яе думку, не варта распыляць сутнасна цэласную спадчыну мастака па розных музеях і архівах. Найбольш важныя творы і артэфакты мусяць быць сканцэнтраваны ў адным месцы, у адной фондавай калекцыі, каб даць аб'ектыўнае ўяўленне пра творчы метад, асаблівасці натуры мастака, пра час, які ён вобразна адлюстраваў у сваіх работах. Хацелася б захоўваць калекцыю ў сталіцы. Хаця, вядома, нешта з твораў і рэчаў мастака можа стаць часткаю іншых экспазіцый і фондаў.

Прадстаўнікоў міністэрства спадарыня Наталля запрашала ў майстэрню, каб яны на свае вочы маглі пераканацца ў каштоўнасці творчай спадчыны Георгія Паплаўскага і канкрэтна абмеркаваць пытанне яе музеефікацыі.

Але ж для стварэння музея неабходна наяўнасць прадметаў музейнага значэння, а таксама распрацаваная канцэпцыі развіцця музея. Другая ўмова — здольнасць заснавальніка музея забяспечыць музей капітальным будынкам, памяшканнем, тэрыторыяй, якія адпавядаюць профілю музея і патрабаванням па захаванні музейных прадметаў навукова-дапаможных матэрыялаў, а таксама абсталяваннем і тэхнічнымі сродкамі, неабходнымі для арганізацыі і ажыццяўлення музейнай дзейнасці. Да таго ж, павінна быць магчымасць увядзення штатных адзінак музейных работнікаў.

А яшчэ ў дадзены момант канцэпцыямі развіцця рэспубліканскіх музеяў не прадугледжана стварэнне персанальных музеяў мастацкага профілю.

Паводле інфармацыі, атрыманай з Мінскага гарвыканкама, стварэнне персанальнага музея Паплаўскага гарадскімі ўладамі зараз таксама не плануецца.

Прыняўшы як дадзенасць праблематычнасць стварэння ў сталіцы новага паўнавартаснага мемарыяльнага музея, Наталля Мікалаеўна звяртаецца ў міністэрства з прапановай зрабіць залу Паплаўскага ў Нацыянальным гістарычным музеі і выказвае гатоўнасць перадаць для яе экспанаты бясплатна. З міністэрства прыйшоў адказ, што гэта прапанова вымагае дадатковага вывучэння і абмеркавання, уласна, з самім Гістарычным, а таксама з Нацыянальным мастацкім музеем і Мінскім гарвыканкамам.

Перспектыва сумоўя, калі збіраюцца разам прадстаўнікі міністэрства, двух найбуйнейшых дзяржаўных музеяў і сталічнай улады, падаецца мне добрым знакам. Будзем лічыць, што гэта нармальны прамежкавы вынік у вырашэнні той складанай і неадназначнай праблемы, якую я закрануў. Вы ж ужо самі, пэўна, зразумелі: чакаць вокамгненны "хэпі-энд" у такой справе наўрад ці выпадае.

Але, усё ж, вырашаць гэта неяк трэба. Бо для сябе ж стараемся...

цей камандай ПРААН далі магчымасць многім жыхарам раёнаў навучыцца браць вырашэнне праблем у свае рукі і атрымліваць доступ да міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

— На мой погляд, у Беларусі, як у краіны з даходам вышэй за сярэдні, асноўныя крыніцы фінансавання павінны быць унутраныя (дзяржаўныя і прыватныя), а не знешнія, — адзначыла Іаана Казана-Вішнявецкая. — Мы ж, у сваю чаргу, можам прапанаваць пілотнае фінансаванне, экспертную падтрымку тых ці іншых праектаў, а таксама стварыць умовы для ўключэння ў праект вялікага кола зацікаўленых асоб.

За гэтымі словамі пастаяннага прадстаўніка ПРААН стаяць рэальныя справы. Напрыклад, у аграгарадку Батвінава Чачэрскага раёна сёння дзейнічае музей хлеба, дзе адраджаюць старажытныя рэцэпты і частуюць бабулінымі прысмакамі з печкі. Мясцовая ініцыятыва была падтрыманая ПРААН, дзякуючы чаму батвінаўскія культработнікі атрымалі каля 25 тысяч еўра на развіццё музея, набылі новую тэхніку і абсталяванне для правядзення майстар-класаў па выпечцы. Адноўлены музей адчыніў дзверы для наведвальнікаў у сакавіку гэтага года.

Сёння ў Музеі хлеба наведвальнікаў вучаць мясіць цеста і выпякаць хлеб у печы, частуюць печывам, салодкай гарбатай і тым самым свежым боханам. Не трэба і казаць, што падобныя музейныя заняткі выклікаюць асаблівую цікавасць у гарадскіх дзяцей, многія з якіх, на жаль, пра такое страдаўняе "ноу-хау", як выпечка хлеба, даведваюцца ўпершыню.

Яшчэ адзін цікавы праект быў рэалізаваны летась у Бярэзінскім біясферным запаведніку, дзе адкрыўся ўнікальны Цэнтр міфалагічнага турызму. Ён уключае ў сябе Музей міфалагічных істот, экспазіцыю пад адкрытым небам "Міфалагічны хутарок" і экалагічную сцежку "У краіне міфаў". "Разынка" экалагічнай сцежкі — 17 незвычайных інсталяцый (Русалка, Палявік, Пушчавік і іншыя), створаныя пры ўдзеле вядомых беларускіх дызайнераў і скульптараў.

Таксама летась пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза ў вёсцы Куршынавічы Ляхавіцкага раёна быў створаны рэсурсны Цэнтр развіцця творчасці і рамёстваў. Установа атрымала фінансавую падтрымку Еўрапейскага Саюза памерам у 26,5 тысяч еўра. Сёння ў цэнтры размешчаны выставачныя залы, вучэбна-творчыя майстэрні і класы з сучасным інтэрактыўным абсталяваннем.

Прыклады, зразумела, можна доўжыць. Але несумненна адно: дэвіз Праграмы развіцця ААН "Дзейнічаем разам" цалкам сябе апраўдаў. І, пэўна, гэта толькі пачатак той працы, якую ладзіць у нашай краіне Еўрапейскі Саюз. Справа ў тым, што Андрэа Віктарын анансавала на форуме новы праект пад назвай "Мясцовае эканамічнае развіццё", назваўшы яго "прамым працягам папярэдняга", а таксама агучыла запланаваны бюджэт — 7 мільёнаў еўра. Асноўны змест праекта — падтрымка малога і сярэдняга бізнесу, а таксама ініцыятыў пачаткоўцаў. Так што тыя культработнікі, хто яшчэ не паспрабаваў сябе ў праектнай дзейнасці, маюць цяпер рэальны шанс рэалізаваць свае цікавыя задумкі.

Дзяжурны па нумары

"Я — начальнік, ты..."

За свой журналісцкі век змяніў ці не з дзясятак рэдакцый. Справа натуральная: чалавек шукае лепшай долі, а газетчык — максімальнага задавальнення ўласных творчых амбіцый. Артыст, мастак, журналіст — істоты капрызлівыя, у несправядлівасці чэзнуць і ніякавеюць. Не надта пашанцавала мне з другім па ліку галоўным рэдактарам. Аднойчы выклікае мяне, дваццацігадовага, і кажа; "Спрачаешся ты, Яўген, пастаянна, а таго, відаць, не ведаеш, што існуе правіла залатое: "Я — начальнік, а ты — дурань!" Дурнем быць вельмі не хацелася...

Яўген РАГІН

Мой галоўны баяўся згубіць аўтарытэт і вынішчаў у іншых любую праяву самастойнага думання. Потым, праз гады, гэты чалавек, даведаўшыся, што я працую ў "ЛіМе", пачаў яго выпісваць і пры сустрэчы са мной цытаваў урыўкі з маіх эсэек. У дзівосным свеце мы жывём, спадарства!

Бацька здзекаваўся з мяне, маладзёна: "Не бойся згубіць аўтарытэт. У цябе яго яшчэ няма". Маці падводзіла пад усё гэта мудрагелістую практычна-тэарэтычную базу: "Спачатку ты працуеш на аўтарытэт, потым аўтарытэт працуе на цябе". Формула, як я зразумеў пасля, — агульнавядомая, аднак далёка не агульнаўжывальная. Бацькі ўсё жыццё адпрацавалі настаўнікамі. Маці лічылася спецыялістам прынцыповым і жорсткім. Выкладала родную мову і літаратуру. Казалі, што "пяцёрку" атрымаць у яе было амаль немагчыма. За яе прынцыповасць я, пачатковец, пастаянна атрымліваў кухталёў ад старшакласнікаў. Не скардзіўся, а хуценька вырас і пачаў даваць адлуп. Бацька, гледзячы на мае гузакі, смяяўся і казаў, што аўтарытэт у мяне — "вулічны". А маме споўнілася днямі 90, у двары з ёю вітаецца ці не кожны другі, і ў мяне такое ўражанне, што вучыла яна паўсвету.

Я праз час сам стаў настаўнікам і зразумеў, з чаго пачынаецца аўтарытэт педагагічны. Пакіньце на некалькі хвілін свой клас і паслухайце, што адбываецца ў аўдыторыі. Калі там ціша, вы настаўнік уплывовы, калі ж вэрхал...

Ну а як справы з аўтарытэтам у сферы рэгіянальнай культуры, якая паспела стаць для мяне роднай? Ды тыя ж самыя законы і формулы дзейнічаюць. Толькі адзін істотны нюанс варта ўлічваць: творцы, што дзеці малыя, да кожнага — свой падыход. "Перахваліш, — прызнаваўся-скардзіўся знаёмы начальнік, — адразу на шыю сесці імкнуцца. Недахваліш — крыўды пачынаюцца". Усё так, знайсці залатую сярэдзіну — справа карпатлівая ды працаёмістая. Іншым кіраўнікам ні вытрымкі, ні такту не стае, каб сабраць летуценную грамаду пад свой штандар. Ёсць больш лёгкі шлях: нагнаць страху, абвесціўшы жалезабетоннае крэда "Я — начальнік, ты — дурань". У такіх калектывах — ціша ці не могілкавая, а слова "крэатыў" выкарыстоўваецца ў агульным лексіконе як лаянкавае. Мала такіх аддзелаў, але ёсць. Дай Бог, каб я памыляўся.

Не раз быў сведкам, калі ў аддзеле часта мяняліся начальнікі, што ніяк не спрыяла ўмацаванню дысцыпліны. І калі трапляўся дасведчаны, рашучы кіраўнік і пачынаў закручваць гайкі, разбэшчаныя бескантрольнасцю падначаленыя ў сваю чаргу пачыналі слаць "цялегі" наверх. Шматлікія праверкі, як вядома, нармалізацыі абстаноўкі не спрыяюць.

У кіраўніка, як падаецца, адно выйсце: трэба пачынаць працаваць на аўтарытэт... У таго ж, хто прыйшоў і абвясціў "Рабі як я!", праблемы неўзабаве пераўтвараюцца ў здабыткі. Так, і гэты варыянт — не з простых. На працу трэба прыходзіць першым і сыходзіць з яе апошнім. І неабходна даваць пастаянна заўважны вынік.

Так, каштуе ўсё гэта немалога здароўя. Але ўзамен дастаецца пачуццё шчырай радасці ад працы, справядлівасці, сяброўства, ад разумення таго, што работнік культуры на сёння — першы чалавек на сяле, а бібліятэкі і клубы застаюцца тымі вясковымі ўстановамі, вакол якіх віруе жыццё.

А вы працуеце на свой аўтарытэт?

Гродзенскі балкон Сільвановічаў

Аляксандра СІЛЬВАНОВІЧА ў поўнай меры можна назваць гродзенскім мастаком. Свой родны горад ён на доўгі час пакідаў хіба толькі падчас вучобы: спачатку ў Гімназіі-каледжы мастацтваў імя Івана Ахрэмчыка, а потым у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Разам з жонкай, дырэктарам Гродзенскай выставачнай залы Ірынай СІЛЬВАНОВІЧ, яны зладзілі не адзін творчы праект. Не так даўно вось спрычыніліся да новага важнага для культуры Гродна пачыну — адкрыцця культурнага цэнтра "Фестывальны", якім таксама кіруе Ірына.

Яшчэ адной нагодай для нашай размовы стала выстава "Рух", зладжаная па запрашэнні куратара Наталлі Сяліцкай у галерэі "Арцель" у Мінску.

Іна НАРКЕВІЧ / Фота з асабістага архіва сям'і Сільвановіч

"Лабірынт".

Аляксандр: Я сабраў для яе работы з некалькіх праектаў. Летась у Сопат мы вазілі вялікую выставу "Сільвановіч і сябры. Бурштынавы шлях". Адтуль і бурштынавая серыя. Да гэтай тэмы звяртаюся ўжо трэці раз, на яе мяне некалі натхнілі фігуркі, убачаныя ў адным літоўскім музеі. Захацелася нешта падобнае зрабіць у жывапісе. Так узніклі невялікія па памеры дошчачкі з выявамі, прысвечанымі паляванню, гандлю, штодзённаму побыту людзей са старажытных часоў. Я абраў для яе і адпаведныя колеры ды адценні — бурштын не толькі жоўты, ён недзе зеленаваты, недзе з чырванню. Таксама на выставе — работы з праектаў "Акварыум", "Спіралі" і асобная серыя "Зграя", якая яшчэ, мяркую, будзе працягвацца. Дынаміку руху падтрымала і класічная серыя "Птахі". У яе ўвайшла карціна "Неба", у якой кампазіцыя хоць і пабудавана на гарызанталях, але рух узнікае за кошт насычэння прасторы сімваламі і знакамі.

— Такое насычэнне твора сімваламі, якія ўтвараюць пэўны арнамент, наогул вельмі характэрна для вашай творчасці. Што натхніла вас на такую манеру?

Аляксандр: Мяне цікавяць руны, пячорны жывапіс, паганскія ідалы, сімволіка старажытнага Егіпта. Крыніц шмат, нешта новае наўрад ці прыдумаеш. Але я знайшоў для гэтых сімвалаў адпаведны маштаб і прынцып, згодна з якім выкарыстоўваю іх у работах. Мне нават не трэба рабіць эскіз, усё ўнутранае напаўненне — гэта ўжо імправізацыя.

— З часам з'явілася і любімая тэхніка выканання?

Аляксандр: Працую па прынцыпе ляўкаса — наношу на дошку ці палатно шмат слаёў. Паверхня павінна стаць цвёрдай як костка, каб на ёй можна было рабіць драпіны, наслаенні, а потым апрацоўваць, дамагаючыся эфекту свячэння. Толькі саму тэхналогію я крыху спрасціў з улікам сучасных магчымасцяў, новых акрылавых шпаклёвак і фарбаў. Дарэчы, у мяне і дыплом быў — каляровы ляўкас.

— Мяркую, што пасля заканчэння манументальнага аддзялення акадэміі мастацтваў у вас было шмат імпэту рабіць менавіта вялікія работы.

Аляксандр: Як манументаліст душу я адвёў сёлета, калі мы рыхтавалі да адкрыцця культурны цэнтр "Фестывальны". На сцяне памерам у 5 на 2,5 метры я алейнымі фарбамі намаляваў фестывальную кветку. А самая першая мая манументальная работа — гэта пано на доме па той самай вуліцы Савецкая. Я тады выйграў сур'ёзны конкурс, прымеркаваны да трэцяга фестывалю нацыянальных культур. Ідэя была ў тым, каб стварыць 16 птушак з нацыянальным арнаментам — па колькасці дыяспар, якія ўдзельнічалі тады ў фестывалі. Усё ў тэхніцы сграфіта і ў кераміцы. Прыемна, што па сённяшні дзень увага да работы не слабне. Да яе прызвычаіліся, і каб не надпіс — 2000 год — многія б, пэўна, лічылі, што красуе яна на той сценцы з сівой даўніны.

— У Гродна вельмі моцная мастацкая аўра, а творчыя сілы, як мне падаецца, згуртаваныя. Я мяркую па шматлікіх калектыўных выставах і творчай падтрымцы гродзенскімі мастакамі адзін аднаго.

Аляксандр: Некалі ў наш горад амаль адначасова прыехала шмат таленавітых мастакоў. Калі нам было недзе па 40 гадоў, мы часта збіраліся разам, рабілі сумесныя праекты, дзяліліся планамі. Сёння ўжо крыху не так. Нам неабавязкова выстаўляцца разам, проста няма такой патрэбы. Напрыклад, Сяргею Грыневічу ўвогуле ніякай падтрымкі не трэба: ён вядомы не толькі ў Беларусі. У скульптара Уладзіміра Панцялеева свае задачы, у Валянціны Шоба свае. У графіка Юрыя Якавенкі таксама ўласныя праекты.

Ірына і Аляксандр Сільвановічы.

"Белы птах".

Ірына: Гродзенская выставачная зала шмат гадоў супрацоўнічае з літоўскімі і польскімі галерэямі, яны добра ведаюць нашу катэгорыю і самі просяць пашыраць межы, запрашаць да ўдзелу ў выставах новых мастакоў. Таму апошнім часам мы актыўна звяртаемся да мінскіх творцаў.

— А ці адчуваеце вы повязь з гродзенскімі мастакамі малодшага пакалення? Ці "з вамі" яны?

Ірына: Так, з намі, але іх мала.

Аляксандр: У моладзі іншы погляд на жыццё. Я не ведаю, што павінна здарыцца, каб я з'ехаў з Гродна. А яны імкнуцца жыць там, дзе ім лепей, і таму вельмі лёгкія на ўздым.

Ірына: Я гляджу на нашага сына Андрэя. Ён скончыў аддзяленне дызайну Гродзенскага дзяржуніверсітэта. Займаецца відэамапінгам, стварае інсталяцыі на фасадах будынкаў, завязвае кантакты з аднадумцамі па-за межамі Беларусі. Але ўдзельнічае і ў нашым гродзенскім творчым жыцці. У нас на кухні за абедам ці вячэрай адбываюцца сапраўдныя творчыя планёркі. Дарэчы, менавіта ён параіў Сашы зрабіць "фестывальную кветку" ў шэрых танах. І сапраўды, яна выдатна патрапіла ў інтэр'ер.

Аляксандр: У Гродна ёсць і маладыя жывапісцы. Напрыклад, Наталля Ляпкіна, чые работы выстаўляліся на "Восеньскім салоне з "Белгазпрамбанкам". Але значных сумесных праектаў яны ладзяць мала — у свой час мы рабілі ў разы больш. Ды і цяпер нам гэта час ад часу бывае цікава. Вось не так даўно выставіліся ў дзяржаўнай галерэі Сопата. Акрамя мяне, туды выправіліся Сяргей Грыневіч, Юрый Якавенка, кераміст Жэня Адзіночанка.

— Ці даўно Гродзенская выставачная зала супрацоўнічае з гэтай галерэяй?

Ірына: Больш за дзесяць гадоў. І штогод у маі ў Гродна прыязджае выстава сопацкіх мастакоў. У нас добрыя творчыя сувязі і з літоўскімі гарадамі — Друскінінкаем, Алітусам.

Аляксандр: Сёння ўсё трымаецца на энтузіязме людзей, якія любяць мастацтва. У Алітусе жыве адна вельмі творчая сям'я — Дыяна Чарняўскене і Валерыус Чарняўскас. У яе праекце "Колеры Нёмана" ўдзельнічаюць мастакі з гарадоў, аб'яднаных гэтай ракой. Летась мы размалёўвалі паветраных змеяў, сёлета — малявалі на парасонах. Добра арганізаваны пленэр мае мноства плюсаў — новыя знаёмствы, сяброўства, абмен вопытам, уражанні. Ён можа стаць вялікай творчай майстэрняй.

— Гродзенская выставачная зала таксама прымае ўдзел у арганізацыі мастацкіх пленэраў і потым робіць справаздачныя выставы.

Ірына: Так, мы штогод гэта робім, як бы складана нам не было. На Гродзеншчыне ёсць фанатыкі сваёй справы — гаспадары аграсядзібы "Каралінскі фальварак Тызенгаўза" Павел і Наталля Клімукі. Яны правялі ўжо пяць міжнародных пленэраў.

Аляксандр: Нам ладзіць такія творчыя сустрэчы ў кайф, а інакш навошта і брацца?

— Дзе вам больш падабаецца выстаўляцца: у Беларусі ці за мяжой?

Аляксандр: Некалі я марыў рабіць выставы ў Італіі і Іспаніі. А мне казалі: Саша, італьянцы цікавяцца італьянцамі, іспанцы — іспанцамі, а беларусы — беларусамі. Я тады не паверыў, але потым дакладна пераканаўся, што гэта так. На мае выставы ў Гродна прыходзіць значна больш людзей, чым у любым іншым горадзе. Я нават раблю па два вернісажы — спачатку для самых блізкіх сяброў, а потым ужо агульны. Бывае так, што калі маленькая галерэя, то ўсе і не трапляюць.

— Што патрэбна для добрага творчага стану?

Аляксандр: Муза. Ідэі. Свой глядач. Калі ты адчуваеш цікавасць да сваёй творчасці, то адразу растуць крылы.

— Ці ёсць звышпланы ці звышзадачы?

Аляксандр: Я гляджу толькі на год наперад. Наступнай восенню адкрыецца выстава ў мінскай галерэі "Мастацтва". А калі робіш выставу ў Мінску, то хочацца яе яшчэ і ў Гродна паказаць. Да ўсяго, жыццё мастака можа змяніцца за гадзіну. Адна сустрэча — і ты ўжо неўзабаве выпраўляешся ў Германію ці Харватыю. Галоўнае — працаваць.

Ірына: А самы вялікі на сёння сямейны праект — рамонт ва ўласнай кватэры. Мы пераканаліся, што такія побытавыя справы можна рабіць без нерваў і сварак. Падыходзім да іх творча і з мінімальнымі матэрыяльнымі затратамі. Саша распісвае мэблю, а я з вялікім натхненнем аздабляю наш балкон. Мы жывем на самым шумным скрыжаванні горада — вуліц Карла Маркса і Сацыялістычнай. Там шмат турыстаў, і калі яны бачаць, як я паліваю кветкі, заўсёды дзякуюць на розных мовах за прыгажосць. Мяне нават не раз ўзнагароджвалі за самы лепшы балкон Гродна. І што цікава: калі я знайшла фотаздымкі нашага дома пачатку мінулага стагоддзя, то ўбачыла на балконе яшчэ больш кветак! Аказваецца, у нашай кватэры заўсёды жылі людзі, якія вырошчвалі на балконе кветкі.

Праз вокны мы бачым шумныя цэнтральныя вуліцы і вежы храмаў, чуем звон, што адтуль даносіцца. Гродна ў добрым сэнсе правінцыйны горад: ты ведаеш амаль усіх яго жыхароў, ходзіш на тэатральныя прэм'еры да знаёмых рэжысёраў і акцёраў. І калі ты любіш свой горад, то адчуваеш, як горад у адказ любіць цябе.

К

Ад пано з саломкі да членства ў FIAPF

Амаль паўтары сотні стужак з усяго свету, шматлікія конкурсныя і пазаконкурсныя праграмы, некалькі складаў міжнароднага журы, індустрыяльная платформа для абмену вопытам паміж прафесіяналамі, імідж галоўнай кінападзеі года ў краіне — гэта ўсё пра "Лістапад" цяперашні. Мы вырашылі згадаць, як і чаму ён з'явіўся ў 1994 годзе, кім стваравуся і што за шлях прайшоў за апошнюю чвэрць стагоддзя.

Вераніка МОЛАКАВА

— Першая палова 1990-х — час відэасалонаў, дзе ўсе штосьці перапісвалі, мяняліся касетамі, каб глядзець кіно, — узгадвае Людміла Саянкова — загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, кінакрытык, аўтар кнігі "Мінскі міжнародны фестываль "Лістапад": праз 20 гадоў" і даўні сябра форуму.

— Сувязі паміж кінематаграфістамі былых савецкіх краін абарваліся, — працягвае яна. — Усе хацелі бачыць новыя фільмы, але ў нас актыўнага фестывальнага жыцця не было, дый мала хто куды выязджаў. Таму і з'явілася прапанова вярнуць кінажыццё і на нашу тэрыторыю. Маўляў, у часы СССР у нас жа была агульная культурная прастора. Чаму б не запрасіць да нас якіх-небудзь расійскіх рэжысёраў і паказаць хаця б тое, што здымаюць яны?

"ТАННА, ВЕСЕЛА І ЛІХА"

Такой ідэяй у той час захапіўся рэжысёр, сцэнарыст і прадзюсар Сяргей Арцімовіч. Зрэшты, калі ён толькі задумваў фестываль, дык працаваў кардыёхірургам.

— Памятаю яго яшчэ з кінаклуба ў старым Доме кіно, што размяшчаўся ў Чырвоным касцёле, — кажа Людміла Саянкова. — Сяргей быў урачом, які вельмі любіць кіно. Ён так жыва рэагаваў на фільмы, з такой цікавасцю і запалам іх абмяркоўваў! Таму і завяршыў сваю медыцынскую кар'еру, перайшоўшы на кінашлях.

— Ён, напэўна, заканчваў вышэйшыя курсы рэжысёраў і сцэнарыстаў у той час, калі я вучыўся ў ВГИКу, — дадае цяперашні дырэктар праграм іграваога кіно "Лістапада" Ігар Сукманаў. — Добра памятаю, як Сяргей аднойчы прыйшоў у інтэрнат і сказаў, што хоча прывозіць у Мінск добрае расійскае кіно. Ужо тады гучала назва — "Лістапад". Першая праграма фестывалю ўзнікла з фільмаў маскоўскага Кінацэнтра, дзе базіраваліся розныя кампаніі.

Складалася яна ўсяго з 14 карцін: "Ганна. Ад 6 да 16" Мікіты Міхалкова (прыз глядацкіх сімпатый і прыз кінематаграфістаў), "Дзеці чыгунных багоў" Томаша Тота, "Звер, які выходзіць з мора" Вітаўтаса Жалакявічуса, "І стаў свет" Атара Іяселіяні, "Каператыў "Палітбюро" Міхаіла Пташука (прыз журналістаў), "Курачка Раба" Андрэя Канчалоўскага, "Над цёмнай вадой" Дзмітрыя Месхіева, "Падмаскоўныя вечары" Валерыя Тадароўскага, "Рускі рэгтайм" Сяргея Урсуляка, "Сады скарпіёна" Алега Кавалава, "Сонца тых, хто не спіць" Тэймураза Баблуяні, "Ты ў мяне адна" Дзмітрыя Астрахана, "Захапленні" Кіры Муратавай, "Чорнае і белае" Барыса Фруміна.

Расціслаў Янкоўскі на адкрыцці "Лістапада-95".

Не было ніякіх першых ці другіх месцаў — сваё меркаванне выказвалі кінематаграфісты і журналісты, гледачы пакідалі ў зале анкеты. Тады ўсе ўдзельнікі "Лістапада" атрымалі ў падарунак парцалянавыя імбрыкі з беларускай сімволікай і пано з саломкі ад кампаній-партнёраў. "Танна, весела і ліха. Так мы гэты першы фестываль рабілі", — распавядаў Сяргей Арцімовіч у інтэрв'ю для кнігі да 20-годдзя фестывалю, маючы на ўвазе сябе, сваю знаёмую з Інстытута культуры Таццяну Кавалёву і пяць яе студэнтаў.

"ЛІСТАПАД" У "КАСТРЫЧНІКУ"

Галоўнай пляцоўкай фестывалю ў 1990-я гады быў кінатэатр "Кастрычнік".

— Цырымоній ніякіх не праводзілі — госці проста ішлі ў залу, потым іх запрашалі на сцэну. Але Сяргей пакрыху ўводзіў дрэс-код. Што было смешна, бо кінатэатр вельмі слаба ацяпляўся, — расказвае Людміла Саянкова. — Я памятаю тую чорна-белую прыгажосць смокінгаў і матылькоў — гэта выглядала ўрачыста. Дамы ў адкрытых сукенках пачуваліся некамфортна. Выходзячы з залы, усе траплялі ў фае. Там жа месціўся клуб і кафетэрый. І адчуваўся пах ці то смажаных піражкоў, ці то бульбы...

Напачатку "Лістапад" быў аглядам кіно краін Балтыі і СНД. У 1990-я праграма фарміравалася, у асноўным, з падачы расійскага Міністэрства культуры, але ў гэтую абойму траплялі і замежныя фільмы.

— Так, яна была іншая, з акцэнтам на масавае кіно, — кажа Людміла Пятроўна. — Фестываль даваў справаздачу па наведвальнасці, а ў "Кастрычніка" вельмі вялікая зала, якая мусіла быць поўнай. Але цяпер, думаю, крытыкаваць тую праграму не варта.

— Першыя фестывалі я наведвала як глядач, — згадвае дырэктар праграмы дакументальнага кіно "Лістапада" **Ірына Дзям'янава**. — Тады паказвалі толькі іграваое кіно. Усе калегі з іншых краін у мяне пыталіся: "У вас жа "Лістапад" у Мінску. Раскажы, што там адбываецца?" Гэта сёння мы ў тры секунды перасылаем лінкі. Тады ты не мог нічога ўбачыць, хаця ўсе адзін аднаго ведалі і цікавіліся, хто што здымае. На "Лістападзе" можна было атрымаць уяўленне пра расійскае кіно. Пазней з'явілася і кіно англійскае, нямецкае, шведскае...

Рэдка, але, усё ж, траплялі ў праграму і беларускія стужкі.

— Не забуду паказ фільма Міхаіла Пташука "У жніўні 44-га" (2000), — распавядае Людміла Саянкова. — Гэта была вельмі гучная прэм'ера, але і горкая — усе спрабавалі падлавіць Пташука, што ён зняў не тое, не так і не туды. У зале літаральна на кожным крэсле развесілі газеты з негатыўнымі фактамі пра здымкі. Але гледачы літаральна валам валілі. Другі гучны беларускі паказ — "Анастасія Слуцкая" (2003). Відаць, туга па сваім кіно была такая, што стужку, нягледзячы на ўсе яе недахопы, віталі стоячы і шквалам апладысментаў.

На першым этапе жыцця фестывалю творчыя сустрэчы і прэс-канферэнцыі таксама адбываліся ў "Кастрычніку".

— Ці то ў кабінеце дырэктара, ці то адміністратараў, — згадвае Людміла Пятроўна, якая ў другой палове 1990-х працавала ў прэс-цэнтры. — Памяшканне было маленькім і вельмі халодным, усе сядзелі ў вопратцы. Журналісты саромеліся. Каб не ўзнікала паўз, мы часам прасілі кагосьці: "Задай вось такое пытанне, калі ласка". Фестываль не тое каб узнік нечакана — патрэба ў ім ужо наспела, а Сяргей проста ўлавіў яе. Але збольшага мы былі яшчэ не гатовыя да такога свята, куды прыедуць замежныя госці, якім трэба забяспечыць пэўны ўзровень пражывання і сэрвісу. Нам усім быў патрэбны перыяд адаптацыі.

ДРОБЯЗІ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯ

Гэта цяпер "Лістапад" грыміць за некалькі месяцаў да свайго пачатку, а ў 1990-я ў яго не было ніякай рэкламы.

— Нават у час фестывалю не ўсе нашы тэлеканалы пра яго распавядалі, ён тады яшчэ не ўспрымаўся як значная для краіны культурная падзея. Газеты часцей пісалі ў іранічным ключы — хто каму на шлейф наступіў і як гэта смешна. Жудасныя памылкі дапускаліся ў прозвішчах, імёны блыталіся пад фатаграфіямі. Сёе-тое я спецыяльна захавала для свайго архіва, — кажа кінакрытык.

Па яе словах, за прамінулыя гады істотна змянілася і публіка. Бо на пачатку фэст яшчэ не быў "пунктам зборкі" ўсёй кінематаграфічнай супольнасці краіны.

— У 1990-х мы дзівіліся, што многія нашы рэжысёры з імем не наведваюць "Лістапад", — дадае яна. — Калі запыталася ў аднаго з іх, чаму, ён мне адказаў: "Навошта мне глядзець тое, што хтосьці зрабіў лепш за мяне?" Цяпер жа творчая моладзь ахвотна ходзіць на прагляды. І публіка задае такія глыбокія пытанні, што я дзіўлюся і захапляюся.

Па словах Людмілы Саянковай, "Лістапад" напоўніцу загучаў толькі ў 2000-я. Пазней змянілася і галоўная пляцоўка — ёю стаў кінатэатр "Цэнтральны".

— Паўсюль з'явіліся рэкламныя шчыты, афішы. Узнікла фестывальнае інфармацыйнае поле. Падавалася б, дробязі, але каб яны з'явіліся, мусіла прайсці дзесяцігоддзе, — адзначае кінакрытык.

Увесь гэты час трансфармавалася і ўласна праграма, і крытэрыі яе адбору. У 1998 годзе спецыяльна для дзіцячай аўдыторыі з'явіўся "Лістападзік". З 2003-га геаграфічныя межы конкурсных стужак заўважна пашырыліся далей за краіны Балтыі і СНД. А з 2007 года на "Лістападзе" сталі паказваць і дакументальнае кіно.

— Раней нават не ўзнікала думкі такой, бо "Лістапад" быў настолькі гучным, што, падавалася, больш нічога яму і не трэба, — кажа Ірына Дзям'янава. — У той год дырэктарам была Валянціна Сцяпанава. Яна да гэтага ўжо некалькі разоў запрашала мяне ў журы, і ўвогуле я была "пры фестывалі". Мне сказалі: "Давай збіраць дакументальную праграму". І першы раз мы арганізавалі не конкурс, а паказы фільмаў пецярбургскага фестывалю "Пасланне да чалавека". Яны прайшлі ў "Цэнтральным" пры вельмі сціплай аўдыторыі. Ідэя замацавалася, і потым мы сталі збіраць ужо конкурсную праграму, але ў яе не было свайго аблічча — збіралі ўсё, што маглі сабраць. Я разумела, што трэба мяняць падыход. Калі прыйшла цяперашняя каманда, у праграмы з'явілася свая мастацкая логіка і канцэпцыя — у конкурс сталі адбіраць кіно краін былога сацлагеру. І прафесіяналы ацанілі такі падыход, які замацаваўся ў апошнія гады. Што ж будзе далей — нас саміх цікавіць.

К

Хроніка "Лістапада"

1994. Дырэктар — Сяргей Арцімовіч. Прызы — ад кінематаграфістаў, журналістаў і гледачоў.

1995. Прэзідэнтам фестывалю стаў Расціслаў Янкоўскі і займаў гэту ганаровую пасаду да 2016 года.

1996. Дырэктар — Валянціна Сцяпанава. Галоўная ўзнагарода фестывалю — прыз глядацкіх сімпатый.

1998. З'явілася праграма дзіцячага кіно "Лістападзік".

2007. Першая спроба сабраць дакументальную праграму.

2009. Дырэктар — Аляксандра Захарэвіч.

2010. Дырэктар — Анжаліка Крашэўская. З'явілася пасада дырэктара праграм іграваога кіно, ім стаў Ігар Сукманаў. Галоўную ўзнагароду зноў вызначае журы.

2014. Заснаваны Нацыянальны конкурс для айчынных кінематаграфістаў.

2011. "Лістапад" атрымаў часовую акрэдытацыю Міжнароднай федэрацыі асацыяцый кінапрадзюсараў FIAPF.

2013. Фестывалю далі пастаянную акрэдытацыю FIAPF.

2017. "Лістапад" далучыўся да Міжнароднай асацыяцыі кінакрытыкаў FIPRESCI.

Стыльная Муха і закаханы “батан”

У Цэнтры творчых праектаў сталічнага ТЮГа паставілі “Муху-Цакатуху”, пазначыўшы яе ўзроставай катэгорыяй 0+. Атрымаўся добры (у абодвух сэнсах слова), відовішны, напоўнены інтэрактывам спектакль для ўсёй сям’і, дзе ёсць над чым паразважаць.

Надзея БУНЦЭВІЧ /
Фота прадастаўлена тэатрам

У ТЮГу — новы спектакль для гледачоў 0+.

Вершаваныя творы ставіць цяжка, асабліва для дзяцей. Бо ёсць небяспека сысці ў механічнае дэкламаванне, хіба з некаторым дадаткам відовішча. Рэжысёр Ганна Казлова шчасліва пазбягае гэтага, абіраючы жанр “музычнай фантазіі”, ажыццёўленай з улікам найсучасных тэатральных тэндэнцый. Відавочна, што пры яе падрыхтоўцы была перачытана-перапрацавана ўся паэтычная творчасць Карнея Чукоўскага. Узніклі нават моманты стылізацыі, парадыйнага пераймальніцтва, якое так блізка дзятве. Штосьці наўмысна чытаецца па складах. Штосьці — паўтараецца безліч разоў. А ўсё астатняе — пераказваецца ў “вольным перакладзе” з літаратурнай мовы на ўласна тэатральную і музычна-пластычную.

У музыцы — шыкоўная полістылістыка: атмасферныя “фонавыя” ўсплёскі-трэкі, дапоўненыя шапатанням-шоргатам, поп, рок, рэп (кампазітар — акцёр тэатра Генадзь Гаранскі). Гэтыя элементы аб’ядноўваюцца скіраванасцю спектакля на сучаснасць, стыльнасць, высокі мастацкі густ.

Усе персанажы зроблены з любоўю. Сярод іх няма гэткіх ліхадзеяў, якіх трэба пакараць (і Павук не выключэнне). Няма, уласна кажучы, і казурак у поўным сэнсе слова. Гэта ўвогуле не казка! А звычайная школьная (і, шырэй, карпаратыўная) гісторыя, дзе ў цэнтры — даволі працяглае святкаванне і раптоўныя канфлікт, што на ім адбываецца. Ідучы на рускай мове, пастаноўка ў чымсьці працягвае колішнія нацыянальныя традыцыі “абраду на сцэне”, толькі замест Купалля ці вяселля — дзень народзінаў у сучасным фармаце. Мы бачым не столькі казурак, колькі звыклую дзіцячую, а таксама падлеткавую, моладзевую тусоўку, ажно да тонкіх пракецый на “офісны планктон” (невыпадкова госці сядзяць не за адным “сямейна-вяселльным” сталом, а паасобку, кожны — за сваім).

У Чукоўскага была пазначана, прычым пунктірам, толькі адна характарыстыка, дый тое ўсім відавочная — “Бабочка-красавица”. У спектаклі гэтае азначэнне пашыраецца да “першай прыгажуні” класа, курса ці якога іншага калектыву. Не менш пазнавальныя і астатнія злёгку шаржыраваныя, але з любоўю намаляваныя характары-тапыжы, кожны са сваёй адметнай пластыкай ды манерамі (харэограф — Вольга Скварцова). Прусак — заўзяты спартсмен: ён і штангу цягае, і аэробіку праводзіць у глядзельнай зале. Блыха і Божая кароўка — дзве сяброўкі-пляткаркі. Конік — негалосны лідар: менавіта ён прыдумляе зрабіць для імянінніцы намаляваныя падарункі, ладзіць у яе гонар імправізаваны канцэрт. І ўвесь час пачуе сябе “журналістам, які вядзе даследаванне” або рэпарцёрам “з месца падзей”: ён і каментарыі раздае, і на смартфон усё здымае.

Муха — шэрая мышка, гэткая сціплая выдатніца ў акулярах, але таксама вельмі стыльная. Камар — тыповы “батан”, у яе закаханы. Яны даўно сябруюць і ўвогуле шмат у чым падобныя. Нават іх сінічныя строі — бы розныя мадэлі адной дызайнерскай калекцыі. Павук, апрануты як “круты байкер”, выязджае на маленькім веласіпедзіку пад роў матацыкла: што ж, жаданае не заўжды адпавядае рэчаіснасці. Ён звычайны ўланнік з улюбёным словам “мае!” — і мамчын сынок, які прызвычаіўся атрымліваць усё, што ні пажадае. У паядынку з ім Камар хіба крылцамі трапеча: сілы няроўныя. Але перамога вырашана бліскуча і пераканаўча: замест шаблі, якая ў Чукоўскага асацыявалася з рамантызаваным гусарствам ці конніцай часоў грамадзянскай вайны, Камар бярэ хітрасцю. Ён “скручае галаву” мадыфікаванаму, упрыгожанаму ілюмінацыяй байку — і ўсё: Павук пад рогат залы кліча маму.

Сцэнаграфія (мастак — Дар’я Волкава) даволі простая і адначасова цалкам функцыянальная. Заднік нагадвае вялізны кавалак сшытка ў клетачку, на якім намаляваныя кветкі. Такой жа тканінай абцягнуты столікі на колцах з прымацаванымі да іх крэсламі. Ёсць і школьная дошка, і дошчачкі паменей, на якіх дзецям будзе прапанавана малявацъ, седзячы ў зале. Вялізная кветка ператвараецца то ў мікрафон, то ў электрагітару. Ніякіх плошчавых камбінезонаў у духу пасляваенных гадоў. Ніякай жудасной пярэстасці, ад якой мітусня ў вачах. Усе строі — па законах авангардная маладзёжнай моды. Герої-казуркі апрануты так, што ў гэтых строях можна смела рушыць на модную вечарынку (ну, хіба крылцы за спінаю ды вусікі на капялюшыках прыбраць) — і стаць не аб’ектам прыколаў, а цэнтрам увагі і зайздрасці.

Артысты, дарэчы, гэтак сябе і пачуваюць. Яны іграюць з такім непрыхаваным задавальненнем, быццам папраўдзе гуляюць з усімі намі ў новую забаўку.

Беларускі шоукейс, які складаў дзесяць спектакляў з агульных 19-ці, абмяркоўвалі запрошаныя на фестываль замежныя крытыкі (гл. “К” № 41). Разгорнутыя рэцэнзіі на гэтыя спектаклі мы давалі яшчэ раней — пасля прэм’еры кожнага з іх. Таму больш мэтазгодна засяродзіць увагу на міжнароднай праграме. Але, вядома, параўноўваючы яе з беларускай. І не забываючыся на Школу TEARTa, у рамках якой ладзіліся майстар-класы, творчыя сустрэчы, абмеркаванні.

У стане разгерметызацыі

Надзея БУНЦЭВІЧ

“Проста кіназдымка”.

“Вяселле”.

Міжнародная праграма прайграваліся сёлета беларускай не толькі ў колькасці. Як заўжды, яна была разнастайнай — ды не спраўджвала надзеі выключна на шэдэўры сусветнага ўзроўню. Ды ўсё ж да замежных спектакляў TEARTa трэба ставіцца крыху інакш — найперш як да магчымых імпульсаў для далейшай уласнай творчасці. Шукаць у іх мо і не дасканала ўвасобленыя, але, усё ж, перспектыўныя ідэі, якія варта развіваць надалей. Вось і паглядзім, чаму можна было навучыцца на замежных паказах.

МАСКУЛЬТУРА? ЦУДОЎНА!

Сучаснае мастацтва дае шмат прыкладаў, калі не толькі яго акадэмічныя пласты падсілкоўваюць масавыя з’явы, але і наадварот. Што ў чарговы раз даказае: не бывае жанраў-стыляў-кірункаў добрых ці дрэнных — усё залежыць ад прафесіяналізму творцы. **“Арктыка”** з Бельгіі — постмадэрнісцкі дэтэктыў, “спісаны” з “Дзесяці нетрышэнят” Агаты Крысці, толькі колькасць ахвяраў зменшана. Змрочная атмасфера ўвесь час разбаўляецца гумарам. Вялізны мяздзезь на чатырох лапах — шыкоўная роставая лялька з двума артыстамі ўнутры. Сцэнічнае дзеянне спалучаецца з відэатрансляцыяй таго, што адбываецца за дзвярыма — у калідоры і на палубе лайнера. Але знешняя відовішнасць ды неверагодная сцэнаграфія — толькі “прынада” для сур’ёзнага аповеду, які ўздымае цэлы шэраг актуальных тэм: ад палітыкі і карупцыі да аховы навакольнага асяроддзя.

Паўднёвакарэйскі спектакль **“Даркнес пумба”** заварожвае пластыкай, спевамі, жывым інструменталам, засвойваннем артыстамі не толькі сцэны, але і ўсёй глядзельнай залы. Паводле стылістыкі, энергетыкі, драматургіі — шыкоўны нацыянальны мюзікл, які ўзрос з традыцыйнага карэйскага жанру панхоры і паяднаў яго з сучасным мастацтвам. А паводле зместу? Пра гэта можна было толькі здагадвацца. Тая ж сітуацыя з адсутнасцю перакладу ці хаця б сціслага пераказу напаткала запрошаных на форум замежных гасцей, калі яны прыйшлі глядзець “Новую зямлю” Брэсцкага тэатра лялек. Дык навошта здзіўляцца, што іншаземцы нічога не зразумелі?

Французска-в’етнамскі **“Сайгон”**, прысвечаны тэме вымушанай эміграцыі, ішоў на дзвюх мовах (гэтак жа, дарэчы, як і “Проста здымка”, дзе акрамя фінскага была “ламаная” англійская). З гіперрэалізмам сцэнаграфіі, які сёння ў трэндзе еўрапейскага мастацтва, спалучаліся такія в’етнамскія асаблівасці, як запаволены тэмпарытм і інтанацыі плачу ў вуаленні. Спектакль адкрывае не самыя вядомыя нам старонкі гісторыі, балансуючы між дзвюма датамі. 1956 год — гэта канчатковы вывад французскіх войскаў з тэрыторыі В’етнама. А праз сорак гадоў, у 1996-м, в’етнамскія эмігранты, якія па розных прычынах з’ехалі разам з французамі, атрымалі нарэшце магчымасць вярнуцца на радзіму.

“Жніво” Польскага тэатра танца з Познані ўтрымлівала добрую ідэю — паяднаць сельскагаспадарчы цыкл і працэс вырошчвання ўраджаю з чалавечым жыццём, а contemporary dance — са спеўнай фальклорнай аўтэнтыкай і блізкімі да яе аўтарскімі кампазіцыямі. Але ўвасабленне пакідала жадаць лепшага. Харэаграфія аказалася ніякаватай, заснаванай на агульных формах руху, з адзінай запамінальнай позай, якая шмат разоў паўтаралася, ды не мела развіцця.

Т ут мне ўзгадалася праграма Belarus Open — і монаспектакль “Дарожка мая”. У ім ярка выяўлена падобная скразная лінія — паралелі між порамі года і перыядамі чалавечага жыцця. Але там літаральна ўсё дыхае гармоніяй, а ў ахопе беларускай музычнай абрадавасці і асабістых успамінаў Івана Кірчука ўзнікае спектакль **Czterdziesci (40)** вышэйзгаданага калектыву з Познані. Гэта было штосьці накшталт літаратурнага тэатра, дзе голасам “ад аўтара” апавядалася гісторыя жыцця гераіні, але з хаф-рэаграфічна-пластычнымі “ілюстрацыямі”, у якіх дзеянне перапынялася, каб мы разгледзелі “карцінку”.

А між іншым: чаму б не выкарыстоўваць штосьці падобнае для ўвасаблення дзіцячых казак? Бо, да ўсяго, гэта не што іншае, як зварот да пачаткоўва этапу развіцця балета, напрыклад, у Расіі, дзе ў далёкія дакласічныя часы практыкаваўся папярэдні аповед вядучага, пра што будзе наступная танцавальная сцэна (і рудымент гэтага захаваўся ў оперы Даргамыжскага “Русалка”, дзе маленькая Русалачка загаварыла).

Czterdziesci (40).

Міжнародная праграма TEARTa сёлета ўтрымлівала два прынцыпова розныя адказы на даўняе пытанне: як ставіць драматургічную класіку? У **“Вяселлі”** Вільноскага гарадскога тэатра ў пастаноўцы Оскараса Каршуноваса ад п’есы Брэхта застаўся хіба сюжэтны каркас. Але ён аброс новым тэкстам — імправізацыямі ў жанры сторытэлінгу, які шырока выкарыстоўваецца сёння нават у бізнес-тэхналогіях. Так называюць вольныя пераказы, часта з “прыколамі”, на мове, максімальна блізкай да аўдыторыі. Яны цікавыя не толькі зместам, але яшчэ і асобай апавядальніка. Падчас спектакля мы сталі сведкамі сучаснага вяселля — ды яшчэ і паспраўднае “касмічнасць”. А колькі гадоў таму былі ж у нас яшчэ і выкшталцоныя кампазіцыі Ларысы Сімаковіч, дзе яна яднала імпрэсіяністцкія апрацоўкі фольку з харэаграфіяй у стылістыцы contemporary і разважала на філасофскія тэмы. Ды, на жаль, такія пачыны не атрымліваюць у нас належнага развіцця.

СТОРЫТЭЛІНГ СУПРАЦЬ ПЕРШАКРЫНІЦЫ

Балет і філасофія — рэчы ў цяперашнім свеце роднасныя. А харэаграфія і літаратура? Здавалася б, жанр харэадрамы, дзе пантаміма рухае сюжэт, а танцы становяцца ўстаўнымі нумарамі, — пройдзены этап. Але на новым узроўні спалучэння такіх спробы працягваюцца, у чым пераканаў гуць далучыцца новыя слаі насельніцтва.

Сцэнаграфія ж уяўляла з сябе дом “у разрэзе” — погляд зверху. Толькі замест сцен — іх прачэрчаныя абрысы, як у праекце. Той жа “праект” з подпісамі, дзе які пакой, змешчаны ў прагрэмках, побач з “пашыраным” пералікам дзейных асоб, які ўтрымліваў мінібляграфію кожнага героя. Асветніцтва вышэйшай пробы! Але раптам згадаўся наш колішні спектакль “Драй швэстэрн” Аляксея Ляляўскага, дзе чэхаўскія персанажы паўставалі ў новых ракурсах, а гісторыя, напісаная ў 1900-м, была “працягнута” ў далёкіяшыя дзесяцігоддзі з іх масавымі расстрэламі тузенбахаў.

Дарэчы, ці ж не добры знак, калі прыйшоўшы на спектакль міжнародній праграмы TEARTa, якая збірае самую смятанку сусветнага тэатральнага працэсу, ты раптам згадваеш айчынныя пастаноўкі? Пэўна, менавіта ў гэтым і выяўляецца разгерметызацыя: нашы дасягненні ці недахопы трэба разглядаць не толькі на “тутэйшым” узроўні, але і з прыцэлам на замежны розгалас.

Фота Яўгеніі Налецкай і Аляксея Піваварчыка

Так назвала сваю апошнюю выставу ў Светлагорскай карціннай галерэі “Традыцыя” імя Германа Пранішнікава мясцовая мастачка Ірына Рагавая. Нібы прадчувала нешта… Літаральна праз некалькі дзён пасля вернісажу нашай таленавітай землячкі не стала.

“Вяртанне дадому”

Яе творы адразу ж звярнулі на сябе маю ўвагу. Карціны “Кірыла і Мяфодзій”, “Архідзяк”, “Старая вярба” захапілі дзіўным майстэрствам ператварэння задум у маляўнічую рэальнасць. Каларыт на яе палотнах станавіўся аб’ёмным, ён дыхаў. Думаў падзяліцца з Ірынай Аляксандраўнай гэтымі ўражаннямі ці напісаць пра іх у рэцэнзіі на выставу. Але вось не паспеў.

Скончыўшы Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава, Ірына сціпла настаўнічала ў адной са школ нашага горада. Ад маёй прапановы працаваць у галерэі яна адмовілася, — не хацела пакідаць сваіх любімых вучняў. Пры знаёмстве адразу ж адчуў яе глыбіннае захапленне беларускай гісторыяй. Таму не здзівіўся, што на персанальных выставах пераважалі карціны гэтай тэматыкі. Да ўсяго, Ірына Рагавая не проста любіла гісторыю Беларусі, але і імкнулася глыбока ўсвядоміць яе праз легенды і паданні. Адсюль і яе рамантызм — з узвышанасцю пачуццяў і па-жаночаму дэталізаваным адзеннем ды ўпрыгожваннямі.

Ірына Рагавая.

Дзіўнае адчуванне: чым больш узіраешся ў творы гэтай мастачкі, тым больш разумееш, што яна не проста пісала, узнаўляючы тыя ці іншыя гістарычныя падзеі, а ілюстравала іх. Гэтак жа, як ілюстравала знакаміты раман Уладзіміра Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”. Зрэшты, і тут, што называецца, яна ішла па слядах гістарычных легенд і паданняў, але ўжо пераўвасобленых класікам беларускай літаратуры. Трыццаць кампазіцыйна акцэнтуецца на галоўных падзеях: “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Здрада”, “Прывады мінулага”. Мастачка вельмі тонка адчувала адрозненне відочнага ад уяўнага. Так і хочацца сказаць, што прывіднае яна пісала... прывідна. Глядзіш на пагоню — і ў памяці гучыць караткевіцкае: “У жудасным маўчанні шалёна скача над зямлёй дзікае паляванне караля Стаха... Патанаючы напалову ў смузе, імчыць над змрочнаю зямлёй дзікае паляванне”. Аднак імглістая расплывістасць у гэтым трыццаць кантрастуе з адкрытай дэталізацыяй, маляўнічай яркасцю.

Гэтак жа пераканаўча і па-мастацку дакладна здолела Ірына Рагавая ўвасобіць Рагнеду. Нават сюжэтна яе твор адрозніваецца ад увасабленняў іншымі мастакамі гэтай легендарнай жанчыны. Мы бачым Рагнеду на дашчаным памосце з малалетнім сынам, якога яна прыцісне да сябе, засцерагаючы ад таго, што павінна здарыцца. Побач, за памостам, лодка. З утоеным захапленнем глядзяць на княгіню весляры, якім загадана адвезці няскораную ў Заслаўе.

Па-свойму здолела мастачка перадаць засяроджаную веліч Ефрасінні Полацкай. Здавалася б, традыцыйны сюжэт: мы бачым святую ў келлі Полацкага Сафійскага сабора за перапісваннем і перакладаннем старажытных кніг. Ёсць тут і знакаміты Ефрасіннеўскі крыж. Але пры гэтым мастачка стварае менавіта такі каларыт карціны, ад якога ўзнікае адчуванне сапраўднай старажытнасці часу.

Гэта ж уласціва і шматлікім іншым творам Ірыны Рагавой на тэмы беларускай гісторыі. Кожны з іх узнаўляе тую ці іншую легенду, у якой апаэтызаваныя рэальныя гістарычныя падзеі. Вось, напрыклад, радкі з “Аповесці мінулых гадоў”: “Дружына спіць, але Волх не спіць. Ён абернецца шэрым воўкам, бегае, скача па цёмных лясах...” І мы бачым гэтага Волха на карціне Ірыны Рагавой: ён глядзіць на нас хітраватым чалавечым позіркам.

Пераканаўча звяртаецца Ірына Рагавая да легенд Мірскага, Нясвіжскага і Гальшанскага замкаў. Трывожнай рамантыкай, вернасцю гістарычным рэаліям прываблівае ўвагу шматфігурная кампазіцыя, прысвечаная Грунвальдскай бітве.

Так, кар зразумець сутнасць гістарычных карцін, трэба ведаць беларускую гісторыю. Але ёсць сродзе не набыткаў і проста пейзажы, нацюрморты, партрэты, і яны таксама сталі сведчаннем сапраўднага майстэрства. Творчая спадчына Ірыны Рагавой сапраўды багатая. На жаль, яна амаль невядомая аматарам выяўленчага мастацтва Беларусі. Такое знаёмства і прызнанне яшчэ павінна адбыцца. І тады імя таленавітай светлагоркі стане неаддзельным ад мастацкай гісторыі нашай краіны.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ

30 кастрычніка Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, Беларускі фонд культуры і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў правялі на базе апошняй установы "круглы стол" на тэму "Традыцыйная культура беларусаў: сучасны стан, праблемы захавання і развіцця". У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскіх арганізацый і творчых суполак, кіраўнікі абласных метадычных цэнтраў, навукоўцы, работнікі ўстаноў культуры, фалькларысты… Мадэратарамі "круглага стала" выступілі прарэктар па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Віктар Языковіч і старшыня Беларускага фонду культуры Тадэуш Стружэцкі.

Яўген РАГІН

Пра ваду і камень

Каму патрэбны інавацыйныя методыкі далучэння да народнага беларускага мастацтва?

У ЯКАСЦІ ЭПІГРАФА

Падставай для гаворкі сталі заключныя мерапрыемствы Х Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня". Пастараюся вылучыць акцэнты кожнага выступлення так, каб стаў зразумелым агульны настрой. І думаецца, што варта пачаць артыкул з канца дзеі, калі з заключнай рэплікай выступіла **вядучы спецыяліст аддзела інфармацыйна-аналітычнага павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алена Каліноўская**. Яна адзначыла, што рэспубліканскімі і мясцовымі арганізацыямі назапашаны вялізны досвед у справе захавання і развіцця беларускай традыцыйнай культуры. Вось толькі дзе яго абагульняць? Аддзел традыцыйнай культуры знік разам са знікненнем Інстытута праблем культуры. Скасаваная кафедра беларускай музыкі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Словам, прыдатнай структуры з адпаведнымі важкімі паўнамоцтвамі пакуль няма. Хаця, здавалася б, багатую практыку "Берагіні" па захаванні спадчыны наспела пара ўжо не проста абагульняць, а занесці ў Дзяржспіс нематэрыяльных культурных каштоўнасцей.

Традыцыйная культура пакуль не стала дзейсным фактарам выхавання нацыянальнай свядомасці беларусаў, яна не мае шырокай запатрабаванасці ў нашым грамадстве, — занепакоена канстатаваў **Тадэуш Стружэцкі**. — І, безумоўна, гэтая праблема — адна з галоўных. Хтосьці з прысутных паіранізаваў з горыччу: "Гэта ж колькі гадоў запар мы будзем безвынікова ўзнімаць усе гэтыя пытанні?" "Кропля вады камень точыць", — адказаў старшыня Беларускага фонду культуры.

"Берагіня" — навукова-метадычны і культурна-адукацыйны праект. Гэта тое, чым можна і трэба ганарыцца на ўвесь свет. Аднак кожны раз ён рэалізоўваецца з вялікімі цяжкасцямі. З аднаго боку, мы пагаджаемся, што традыцыйная культура — найпершы складнік ідэалогіі, з другога ж, яна нярэдка ўспрымаецца як дэкаратыўны элемент аздобы таго ці іншага мерапрыемства. Нам нібыта сорамна за тое, што Беларусь вылучаецца багаццем ды разнастайнасцю сваёй каранёвай культуры сярод многіх еўрапейскіх краін.

І ў чарговы раз на "круглым стале" было прыгадана, што гэтае пасяджэнне, як і аналагічныя папярэднія, ладзіцца ў адпаведнасці з Планам мерапрыемстваў па рэалізацыі Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (зацверджаны Распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 218 ад 7 жніўня 2002 года, раздзел VI, п. 95. 2) і пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "Аб Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва "Берагіня" (ад 05. 03. 2008 года).

НЕ СТАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Тадэуш СТРУЖЭЦКІ, старшыня БФК:

— Няма сістэмы, бо няма адпаведнай дзяржаўнай або галіновай праграмы захавання і развіцця традыцыйнай культуры. Няма яднання ў гэтым кірунку паміж сістэмамі адукацыі і культуры. Скарачаецца колькасць яе носьбітаў. Няма дасюль і інфармацыйнага банку дадзеных, аб стварэнні якога былі запісы ў многіх афіцыйных дакументах, у тым ліку і ў Дзяржаўнай праграме "Культура Беларусі на 2010 — 2015 гады". Тое самае тычыцца і паўнавартаснага сайта "Традыцыйная культура".

Мікола КОЗЕНКА, аўтар канцэпцыі, навуковы і мастацкі кіраўнік "Берагіні":

— "Берагіня" — гэта сістэма этнавыхавання, якая грунтуецца на прынцыпах выяўлення, аднаўлення, пераймання мастацкай культуры менавіта сваёй малой радзімы. Мяне, як аўтара праекта, вельмі хвалююць вось якія пытанні. Па-першае, адсутнасць Дзяржпраграмы "Традыцыйная культура і дзеці Беларусі". У суседняй Украіне такая праграма была прынята яшчэ напачатку 1980-х гадоў. Па-другое, адсутнасць рэспубліканскага каардынацыйнага цэнтра. У Расіі такім цэнтрам з'яўляецца Дом народнай творчасці, у нас жа яго аналагаў пакуль няма. Не пашкодзіў бы ў Беларусі і Саюз фалькларыстаў. Па-трэцяе, патрабуе ўдасканалення палажэнне аб правядзенні фестывалю. Па-чацвёртае, хвалюе праблема кадраў. У прыватнасці, у нас бракуе этнахарэографаў. Затое ёсць спецыялісты па сучасных эстрадных танцах.

Святлана ГУТКОЎСКАЯ, загадчык кафедры харэаграфіі БДУКіМ:

— Што такое этнахарэограф? Гэта пытанне дыскусійнае. Любы балетмайстар павінен ведаць нашу спадчыну, яе фальклорныя першакрыніцы. На кірунак спецыяльнасці "народны танец" мы прымаем дваццаць студэнтаў, а на астатнія — толькі шэсць. Беларускі танец вывучаецца два гады, чатыры семестры. Кафедра шмат робіць для папулярызацыі нашай народнай харэаграфіі. На курсе "мастацтва балетмайстра" рыхтуюць, можна так сказаць, і этнахарэографаў, бо цэлы год з чатырох вывучаецца беларускі харэаграфічны фальклор. Першае, што вывучаем — гэта першакрыніцы, якія захоўваюцца ў нашай навукова-даследчай лабараторыі "Беларуская танцавальная творчасць". Студэнты пішуць курсавую работу, якой папярэднічае грунтоўная навукова-даследчая дзейнасць.

Мы цалкам падтрымліваем любыя намаганні па папулярызацыі фальклору. Выкладчыкі нашай кафедры нават уваходзяць у склад журы "Берагіні". Але тыя жанры, якія падтрымлівае фэст, — гэта толькі маленькая частка айчыннай танцавальнай культуры. У мяне нават падрыхтавана выданне "Гарадскія побытавыя танцы", дзе ёсць і апісанні сцэнічных узораў, якія выкарыстоўваюць аматарскія калектывы. Так што нашы выпускнікі добра ведаюць беларускі харэаграфічны фальклор.

ТРАДЫЦЫЯ ВЫХОЎВАЕ ТРАДЫЦЫЮ

Анатоль БУТЭВІЧ, намеснік старшыні рады Беларускага фонду культуры, намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь:

— Так, вопыт па захаванні і развіцці традыцыі ў нас назапашаны вялікі. На месцах шмат робіцца. Але, як падаецца, няма скаардынаванага разумення таго, што адбываецца. Шмат па гэтай прычыне дубляжу, разрозненых дзеянняў. Захаванне спадчыны — толькі частка клопату. Гэта цудоўна, што ў нас ёсць база, сабраная падчас фальклорных экспедыцый. Вельмі важна суаднесці колішнюю спадчыну з днём сённяшнім. Павінны быць інтэрпрэтацыі, але і зыходная база — таксама. І самае галоўнае — далучэнне да спадчыны дзяцей. Калі мы будзем звяртаць на гэта пастаянную ўвагу, дык агульны вынік нашай працы стане больш важкім

У верасні ва Уфе (Башкіртастан) адбываўся III Еўразійскі гуманітарны форум па пытаннях культуры і народнай творчасці, які праводзіла расійская камісія UNESCO. Мерапрыемства я наведваў як прадстаўнік камісіі беларускай і, натуральна, распавёў пра "Берагіню", пра тое, як нашы дзеткі разам з бацькамі становяцца натуральнай ды неад'емнай часткай беларускай традыцыі.

Фальклор выхоўвае дзяцей, а фэст спрыяе развіццю пераемнасці. Так, адчуваецца, што няма шчыльнага паядання паміж арганізацыйным камітэтам і тымі, хто працуе на месцах. Дык мо гэтыя функцыі возьме на сябе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў? Тут і база належная захавалася, і спецыялістаў хапае менавіта для навуковага кіравання ўсім працэсам. Калі нічога не рабіць, нічога і не будзе. І тым не менш, я ўпэўнены, што "Берагіня" не загіне, "Берагіня" будзе жыць!

Вольга АНТОНЕНКА, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур:

— Дзейнасць нашага цэнтра мае тры кірункі. У сферы ўвагі — нацыянальныя культурныя грамадскія аб'яднанні, якія зарэгістраваны на тэрыторыі Беларусі (на сёння яны прадстаўляюць 141 нацыянальнасць). Усе яны бяруць удзел у Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур, які ладзіцца раз на два гады. Цэнтр непасрэдна ўдзельнічае ў арганізацыі і правядзенні адборачных мерапрыемстваў, фэсту ў Мінску і заключнага фестывалю ў Гродне. З 2016 года мы падключыліся і да правядзення "Берагіні". Артыстам нацыянальных суполак падабаецца браць удзел у гэтым мерапрыемстве.

Другі кірунак — стасункі з беларусамі замежжа, а гэта больш за тры з паловай мільёны чалавек. Нашы беларускія калектывы едуць з канцэртамі да землякоў. Тыя, у сваю чаргу, не забываюцца на Беларусь. Мы падтрымліваем суайчыннікаў сцэнічнымі касцюмамі, метадычнай літаратурай, сувенірнай

Традыцыя: стан, праблемы

прадукцыяй, творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вынікам усіх гэтых намаганняў стаў Фестываль мастацтваў беларусаў свету. Летась у Мінску прайшло трэцяе такое мерапрыемства, на якое сабраліся беларусы з 19 краін.

Трэці кірунак з'явіўся нядаўна. Гаворка пра Рэспубліканскі цэнтр метадычнага забеспячэння дзейнасці клубных устаноў і народнай творчасці. Мы ўключаемся ў работу. І гэтыя тры нашы вялізныя тэмы шчыльна пераплецены і ўзбагачаюць адна адну.

Ірына ДЗЕМЯНЧУК, дырэктар Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці:

— Жыццяздольнасць аўтэнтычнага калектыву залежыць найперш ад апантанага спецыяліста: метадыста ці кіраўніка ансамбля. На жаль, у раёнах такіх прафесійнікаў амаль няма. А кожны куточак Гродзеншчыны — адметны па сваёй спадчыне гісторыі і культуры. Сабраць бы гэта ўсё, каб не забылася ды не згубілася. Але дзялянка працы немалая. Каб развіваўся фальклор, трэба, каб да яго збору і асэнсавання далучаліся і дзеці, і ўдзельнікі клубных гурткоў ды бібліятэчных фарміраванняў.

"Берагіня" шчырая, свая, непадманная. Фоталетапіс дзіцячага фальклорнага фестывалю, які складаўся цягам дваццаці гадоў. Працяг — будзе. Фота з архіва аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама.

ЁСЦЬ ФАЛЬКЛОР А ЁСЦЬ СТЫЛІЗАЦЫЯ

Вячаслаў КАЛАЦЭЙ, загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, сябра Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь:

— Давайце вызначым розніцу паміж аўтэнтычным фальклорам і стылізаваным. Рэчы гэтыя — несумяшчальныя. Памятаю, я ў 1999 годзе быў на дзіцячым фальклорным фестывалі ў Літве. Наш калектыў паказваў танец, падрыхтаваны Міколам Козенкамі. А пасля нашага выступу давялося пачуць: мы ўпершыню пабачылі беларускую харэаграфічную аўтэнтыку! За мяжой, як бачыце, тую розніцу разумеюць, а ў нас — не заўсёды. Сёння любы фольк-мадэрн разглядаецца як традыцыйны беларускі танец. Таму досвед аўтэнтычнай "Берагіні" — неацэнны.

Нашы студэнты спачатку едуць у фальклорную экспедыцыю, потым сабраны матэрыял апрацоўваюць, развучваюць танец метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі (вуснае перайманне ці ад носьбітаў у час экспедыцый ці па відэазапісе). Наступная фаза — дыпломны праект. Студэнт выконвае танец ці песню разам з носьбітамі. Думаю, менавіта такія механізмы дзейсныя ў справе захавання каранёвага беларускага мастацтва.

Сяргей ВЫСКВАРКА, загадчык аддзела арганізацыйна-метадычнай работы Любанскага раённага цэнтра культуры, кіраўнік узорнага фальклорнага гурта "Верабейкі":

— Аўтэнтыкай "Берагіня" займаецца на самым высокім узроўні. Галоўная мэта аўтэнтычнага фальклору — засяроджанасць, так бы мовіць, на сабе, гэта кожным разам непадманныя слёзы, а сцэнічнага мастацтва — гэта інтэрпрэтацыя мастацтва праз мяне, напрацаваныя эмоцыі. Трэба навучыцца дакладна паўтараць традыцыйны народны твор, а потым імправізаваць вакол яго.

Святлана КАРЖУК, дырэктар Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра:

— Калі ў 2012 годзе ў вобласці было пяць дзіцячых фальклорных калектываў, то да сённяшняга моманту іх колькасць павялічылася ўдвая. І гэта яшчэ не мяжа. Стараемся, каб ля нашых таленавітых бабулек пастаянна шчыравалі дзеткі, вучыліся ў іх і песні, і казцы, і танцу. Так што фальклор на Брэстчыне жывы і будзе жыць.

"БЕРАГІНЯ" — У СПІСЕ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ?

Алесь ЛОЗКА, начальнік аддзела народнай творчасці Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур:

— У краіне 2969 харэаграфічных аматарскіх калектываў, а яшчэ пяць год таму іх было больш за тры тысячы. Ёсць над чым задумацца. Гэта зразумела, што без добрага харэографа тут не абысціся...

Цалкам згодны з тым, што нам патрэбны Саюз фалькларыстаў — пагатоў, ён жа некалі быў! Хачу зазначыць і вось што. Думаю, з рэзалюцыі круглага стала трэба прыбраць пытанне аб стварэнні камісіі CIOFF. Справа ў тым, што аддзяленне Нацыянальнай камісіі CIOFF па арганізацыі фальклорных фестываляў пры UNESCO існуе ў Беларусі яшчэ з 2015 года. Проста, далёка не ўсе карыстаюцца яго паслугамі. А нашы калектывы чакаюць у Славеніі, Швейцарыі, Партугаліі...

Уладзімір ГІЛЕП, галоўны рэдактар "Краязнаўчай газеты":

— У рэзалюцыі не стае аднаго пункта. Час ужо вылучыць фестываль "Берагіня" для ўнясення ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны нашай краіны. Давайце падумаем, як гэта зрабіць. Лепшай падтрымкі для ўнікальнага дзіцячага фэсту і не прыдумаць. Мо тады і іншыя зразумеюць, значнасць этнавыхавання нашых дзяцей. Думаю, што прапанова канкрэтная і рэальная, таму варта шырокага абмеркавання.

МІНІСТЭРСТВА АБАГУЛЬНЯЕ

Таццяна ДРАПАКОВА, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь:

— Змястоўныя выступленні ўдзельнікаў "круглага стала" — яскравае сведчанне актуальнасці заяўленай тэмы. У сферы адукацыі таксама шмат робіцца ў кірунку захавання і развіцця беларускага фальклору. Больш за восемдзясят устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі займаюцца гэтым сістэмна і мэтанакіравана. Напэўна, няма неабходнасці пералічваць усе нашы мерапрыемствы і акцыі. Сёння на ўзроўні дзяржавы дзейнічаюць Канцэпцыя выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканская праграма патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Міністэрства адукацыі гатова прааналізаваць увесь наяўны вопыт працы ў дадзеным кірунку, каб накіраваць свае прапановы спецыялістам па стварэнні нацыянальнай доўгатэрміновай праграмы выхавання моладзі краіны сродкамі традыцыйнай народнай культуры (такая прапанова ёсць у рэзалюцыі "круглага стала"). Мабыць, варта ўнесці таксама пэўныя змяненні і дапаўненні ў дзяржаўныя праграмы, якія ўжо існуюць.

ЭЛІТА ДЛЯ НАЦЫІ

Пытанняў падчас "круглага стала" было ўзнята, як і заўжды, вельмі шмат. Да прыкладу: чаму ў нашых кавярнях не гучыць аўтэнтычная беларуская музыка? Так, не гучыць. Калі і загучыць, дык, спярша, напэўна, як і класіка, у храмах, у камерных залах і нацыянальных літаратурна-музычных салонах. Загучыць як музыка для нацыянальнай эліты. Мо паспрыяюць гэтаму і рэгіянальныя святы фальклору "Спадчына", пра рэгулярнасць якіх так марыць Мікола Козенка...

Пытанне, падаецца, не ў шырспажыўным попыце на нацыянальны фальклор. Ён, як і "Берагіня" — для абраных. Іншымі словамі, падчас адборачных этапаў фестывалю і яго заключнай часткі фарміруюцца не толькі новыя носьбіты традыцыі — ствараецца эліта нацыі. А эліта ніколі не бывае ў большасці. Але менавіта яна становіцца жыццядайнай асновай для ўмацавання нацыі.

Пастаянна згадваю тварык хлопчыка, які пабачыў на апошняй "Берагіні" ў складзе вакальнага гурта Ларысы Рыжковай. З такіх толькі іконы пісаць! Ён сам абраў шлях носьбіта традыцыі і ўпэўнена крочыць па ім поруч з геніяльнай настаўніцай. Безумоўна, такіх не тысячы, мо і не сотні, такіх — дзясяткі. Але гэта тыя дзясяткі, якія не здрадзяць мове, гісторыі, нацыянальнай культуры.

Так, "Берагіня" стала самадастатковай, яна ўжо сама выбірае, каго прыняць пад сваё крыло. Але гэта не азначае, што фестывалю не патрэбна ўсебаковая падтрымка.

К

Кветкі для мамы

У музеі-сядзібе “Пружанскі палацык” працуе персанальная выстава мастачкі Вольгі Данілюк. Менавіта такім чынам яна вырашыла павіншаваць сваю маму Тамару Аляксееўну з днём нараджэння. На кожнай з 19 прадстаўленых работ — кветкі. Іх выгадавалі мама і сястра, прынёс з прагулкі сын. Вольга Данілюк працуе ў тэхніцы алейнага, акварэльнага, пастэльнага жывапісу, цікавіцца батыкам, мастацкім тэкстылем, стварае аўтарскія лялькі, паштоўкі і сувеніры, робіць ілюстрацыі для дзіцячых часопісаў. У 2016 годзе калекцыя беларускай вопраткі Вольгі Данілюк заняла першае месца ў намінацыі “Тэкстыль” на Беларускім тыдні мастацтваў у Мінску. Пра гэта распавяла малодшы навуковы супрацоўнік музея-сядзібы “Пружанскі палацык” Арына Сысыляціна.

Яўген РАГІН

З лістапада ў **Віцебскай** абласной філармоніі прайшло VIII абласное свята-конкурс харэаграфічных калектываў “Прыдзвінскія карункі”. Мерапрыемства было прысвечана стагоддзю з дня нараджэння знанага балетмайстра і заслужанага дзеяча культуры Беларусі Івана Серыкава. Напісала пра гэта вядучы метадыст Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра Ала Лялькіна. *“У мерапрыемстве ўзялі ўдзел сорак творчых калектываў з найменнямі “заслужаны”, “народны” і “ўзорны”,* — працягвае аўтар, — *Агульная колькасць удзельнікаў — больш за 800 чалавек. Конкурс адбыўся па трох намінацыях: “найлепшае выкананне аўтарскіх танцаў Івана Серыкава”, “найлепшую новую балетмайстарскую пастаноўку беларускай скіраванасці”, “найлепшы народны танец нацыянальнай тэматыкі”. Гран-пры атрымала харэаграфічная група ўзорнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля “Перапёлачка” гімназіі № 3 Віцебска імя Аляксандра Пушкіна (балетмайстар Валянціна Вішнеўская). Дарэчы, ансамбль атрымаў прызавыя месцы па ўсіх трох намінацыях. Падчас свята выступілі ветэраны ансамбляў “Маладосць” і “Вытокі”, якія стварыў Іван Серыкаў”.*

Загадчык аддзела маркетынгу **Бярэзінскай** цэнтральнай раённай бібліятэкі Тамара Круталевіч паведамляе, што плёнам сумеснага праекта бібліятэкі і рэдакцыі мясцовай райгазеты стала выданне зборніка публіцыстыкі “Гісторыі ў лёсах”. Кніжку напісала намеснік старшыні раённага савета ветэранаў Ніна Бурко. Героямі замалёвак сталі 94 землякі. Прэзентацыя зборніка адбылася з раённай бібліятэцы. Адзін з герояў зборніка — гарманіст Міхась Папруга, уладальнік дзесяці гармонікаў, жаданы ды вясёлы госць любой кампаніі. Са сваёй музыкай ён нават у Венесуэлу ездзіў у складзе беларускай дэлегацыі на чале з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Пра земляка і цудоўнага пісьменніка Вячаслава Адамчыка распавядае загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі **Дзятлаўскай** раённай бібліятэкі Вольга Бойка. Вячаслаў Уладзіміравіч належыць да пісьменніцкага пакалення так званых шасцідзясятнікаў. 1 лістапада бягучага года яму споўнілася б 85 гадоў. *“У рамках праекта “Юбілей пісьменніка ў бібліятэцы” Дзятлаўская ўстанова прапанавала чытачам наведаць літаратурную гасцёўню і выставу-напамін “Пісьменнік роднай зямлі”,* — паведамляе аўтар допісу.

Загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі **Навагрудскай** раённай бібліятэкі Іна Шаўчук паведамляе: *“У горадзе, дзе ёсць гандлёва-эканамічны каледж, павінна быць і эканамічная кавярня. Нядаўна ў нашай бібліятэцы адбылося чарговае мерапрыемства па рэалізацыі сумеснага з каледжам праекта “Эканамічная кавярня “Асновы бізнесу”. У бібліятэчнай зале быў створаны інтэр’ер кавярні. У гульні ўдзельнічалі дзве каманды студэнтаў. “Меню” прапаноўвала выбраць страву і зрабіць “замову”. Тэмай конкурсу сталі раздзелы эканомікі, значэнне асобных эканамічных тэрмінаў, фактараў вытворчасці. Студэнты прадэманстравалі не толькі добрыя веды, але і інтэлект, здольнасць да лагічнага мыслення. А інфармацыйны літаратурны сняданак стаў добрым даважкам да асноўнай эканамічнай праграмы”.*

Інфармацыя з **Ганцавічаў**. Падчас восеньскіх вакацый дом рамёстваў наведалі школьнікі з раённага цэнтра і вёскі **Кукава**. Для гасцей была падрыхтавана экскурсія, якая распавядала пра мясцовыя рамёствы і промыслы. Пабывалі экскурсанты і ў творчай майстэрні па ткацтве, дзе ім быў прапанаваны майстар-клас. Пазнаёміліся падлеткі і з выставамі абразоў “Пакровы Прасвятой Багародзіцы” і жывапісных работ самадзейнай мастачкі Таццяны Коўш. Экскурсія завяршылася спектаклем лялечнага тэатра.

Падлеткі сталі галоўнымі гледачамі і ўдзельнікамі мерапрыемстваў і ў Палацы культуры **Ліды**. Тут прайшла акцыя “Творчасць — дзецям”. Цягам тыдня малыя былі занятыя ў тэатралізаваным гульнявым прадстаўленні, якое падрыхтаваў узорны тэатр “Какос”, у тэатральнай гасцёўні народнага драматычнага тэатра “Ракурс”. Аматары даўніны сталі ўдзельнікамі інтэрактыўнай інсталяцыі “Сярэднявечная майстэрня”. Знайшоўся час і для больш дэталёвага знаёмства з правіламі пажарнай бяспекі. А ўсе танцавальна-забаўляльныя мерапрыемствы былі аб’яднаныя ў шоу “Дыска-фантазія” са светлалазерным крэатыўным забеспячэннем.

Віцебскі абласны краязнаўчы музей — імяннінік, яму спаўняецца сто гадоў. Цудоўная нагода для цэлага шэрагу імпрэзаў! У іх ліку — прэзентацыі буклетаў музейных філіялаў: Музея гісторыі прыватнага калекцыянавання, Мастацкага музея, Музея-сядзібы Іллі Рэпіна ў **Здраўнёве**. Апошняй установе, дарэчы, спаўняецца 30 гадоў. Ахвотных чакаюць таксама выставы “Рэстаўрацыйная майстэрня”, вышыўкі і фарфору, сотні найбольш цікавых прадметаў з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. 16 лістапада адбудзецца ўрачысты вечар з нагоды музейнага юбілею.

Нізка інфармацый з **Ашмянскага** раёна. Загадчык аддзела культуры і адпачынку аграгарадка **Жупраны** Анастасія Кеда распавядае, што цягам месяца жупранскія маленькія прыгажуні актыўна вучыліся навыкам дэфіле, акцёрскаму майстэрству, сцэнічнай мове і харэаграфіі. А 4 лістапада ўсе яны ўдзельнічалі ў конкурсе прыгажосці. Выпрабаванняў было шмат. Дзяўчаты павінны была прадэманстраваць і талент, і артыстычнасць, і кемлівасць. Падрыхтоўка была грунтоўнай. Кожная канкурсантка атрымала ганаровае званне, а хтосьці — і не адно.

Кіраўнік народнага сямейнага ансамбля “Граўжанцы” з аграгарадка **Граўжышкі** з Ашмяншчыны Алена Сальмановіч даслала ў рэдакцыю дзве інфармацыі. 3 лістапада ў аддзеле культуры і дасугу аграгарадка Граўжышкі прайшла тэматычная праграма для работнікаў мясцовай сельскагаспадарчай арганізацыі. 42 чалавекі былі ўзнагароджаны ганаровымі граматамі. А музычныя віншаванні сябрам дарылі ўдзельнікі мясцовай мастацкай самадзейнасці.

А 4 лістапада ў вёсцы **Шчапанавічы** былі арганізаваны фальклорныя пасядзелкі “У сваім краі, як у раі”. У госці да вяскоўцаў зазірнулі тыя самыя “Граўжанцы”. Была сярод гасцей і гаспадыня Восень з чароўным букетам. Хто патрымаў гэты шыкоўны букет з восеньскай лістоты, той зараджаўся самымі станоўчымі эмоцыямі. Букет перадавалі з рук у рукі пад музыку. Калі яна сціхла, часовы ўладальнік “экібаны” выцягваў з букета лісток з творчым заданнем, якое трэба было абавязкова выканаць. Такім чынам цягам вечара згадаліся любімыя песні ды прыпеўкі, а таксама — танцы “Кракавяк” і “Вішанька”.

Чым знакамітая вёска **Жухавічы**, што ў **Карэліцкім** раёне? Яблычным фэстам! Вікторыя Касцюк паведаміла, што 3 лістапада ў Жухавіцкім доме культуры смачна і весела адзначалі Свята яблыка. Праграма была насычанай. Першае месца ў конкурсе “Шарлотка — 2018” пасля бескампрамісная барацьбы дасталася Таццяне Пучко. Кухар яна — выдатны! Конкурс дзіцячых малюнкаў “Шчодрая восень” паказаў, што самы таленавіты тут Даніл Касцюк. А прыз за найлепшую кампазицыю з яблыкаў атрымала сям’я Лопух.

К

На здымках:
1 Кветкі Вольгі Данілюк.
2 Экскурсія ў Ганцавіцкім РДР.
3 “У сваім краі, як ў раі”.
4 “Яблычна-шашачны фэст”.

Крыло Эраса

У калекцыі музея “Замкавы комплекс “Мір” знаходзіцца французскі веер XIX стагоддзя, на якім адлюстраваны Эрас разам з Псіхеяй. І такі сюжэт — зусім невыпадковы.

Паводле старажытнагрэчаскага падання, бог вятроў Эол моцна закахаўся ў Псіхею, якая была замужам за богам кахання Эрасам, і ўвесь час шукаў з ёй сустрэчы. Аднойчы, калі Эрас адсутнічаў, Эол пранік у пакой да Псіхеі і пачаў яе цалаваць у сне. Але муж нечакана вярнуўся, накінуўся на Эола і ў гневе адарваў яму крыло. Ад такога шуму прачнулася Псіхея. Разгубленая, яна ўзяла крыло ў свае рукі і пачала ім абмахвацца. І менавіта такім чынам з’явіўся веер.

І сапраўды, ён, мабыць, належыць да ліку першых прадметаў, які ўвайшоў ва ўжытак чалавека. Першапачаткова веер прызначаўся для адмахвання ад насякомых, аховы ад сонца, даваў прахалоду. Пазней стаў сімвалам улады і падкрэсліваў сацыяльнае становішча свайго ўладальніка. А потым, на працягу многіх стагоддзяў, з’яўляўся нязменным атрыбутам моды.

У Мірскім замку знаходзіцца адна з самых вялікіх і разнастайных калекцый вееру у Беларусі — агулам іх больш за шэсцьдзясят. Найбольш шырока прадстаўлены творы французскай школы, але таксама ёсць вырабы англійскай, польскай, бельгійскай, нямецкай, рускай, іспанскай, італьянскай, ірландскай і кітайскай вытворчасці. На гэтых веерах адлюстраваны галантныя сцэнкі, міфалагічныя, біблейскія і пастаральныя сюжэты. Многія з іх багата аздоблены роспісам, вышыўкай, гравіроўкай або разьбой.

Лепшыя з гэтых твораў дэманструюцца ў экспазіцыі музея. Яны дапамагаюць зразумець кожнаму, што веер — гэта не проста элегантны аксэсуар, але і самастойны від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Вераніка КРАСОЎСКАЯ,
малодшы навуковы супрацоўнік музея “Замкавы комплекс “Мір”

Ёсць давер, няма адлегласці

Летась у фінал Нацыянальнай тэатральнай прэміі патрапіла нямала праектаў прыватных калектываў, у тым ліку — Камернага драматычнага тэатра (КДТ). Ён спрабуе сябе ў розных жанравых кірунках, эксперыментуе з формай і матэрыялам. А на наступным тыдні прэзентуе сваё бачанне імерсіўнасці: публіку запросяць на містычны трылер паводле Паўла Каэльё "Д'ябл і сеньярыта Прым", у якім кожнаму гледачу прапануецца свая роля. Пра складанасці ў распрацоўцы спектакля, жанр якога пакуль мала распаўсюджаны ў Беларусі, аглядальніку "К" распавяла галоўны рэжысёр КДТ, выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Наталля БАШАВА.

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота Ганны ШАРКО

5D У ТЭАТРЫ

— Канешне, Камерны драматычны тэатр — не першапраходзец. Імерсіўныя пастаноўкі даўно скарылі публіку шмат у якіх краінах Еўропы, зараз збіраюць аншлагі ў Маскве і Санкт-Пецярбургу. Яны практыкуюць поўнае занурэнне гледача ў дзеянне, якое можна параўнаць з эфектам 5D-кінатэатра. І мы гаворым не проста пра адсутнасць сцяны паміж залай і сцэнай — тут увогуле знікае адлегласць паміж гледачом і акцёрам.

Для нашага эксперыменту я выбрала ранні твор Паўла Каэльё "Д'ябал і сеньярыта Прым", бо гэта глыбокі матэрыял з бясконцым мноствам сэнсаў. Легендарны пісьменнік — містык, ён прапануе нам шукаць адказ на пытанне, кім жа ўрэшце рэшт з'яўляецца чалавек: стваральнікам свайго лёсу ці паслухмянай марыянеткай у руках невядомага лялькавода. Каб разабрацца ў гэтым падчас спектакля, гледачы мусяць прайсці рознымі сюжэтнымі сцяжынкамі, складзенымі нашымі артыстамі.

То бок у дадзеным выпадку прагляд і ўдзел — паняцці тоесныя. Яшчэ да пачатку рэпетыцый я вывучала тыпы гледачоў, якія звычайна наведваюць тэатр. Адны не гатовыя да актыўных дзеянняў: ім болей падабаецца назіраць за спектаклем, суперажываць, выбудоўваць лагічныя здагадкі, чаму сюжэт развіваецца так ці іначай. Другія ж хочуць не толькі глядзець, але яшчэ, напрыклад, танчыць ці адказваць з месца на пытанні акцёраў. Трэція ірвуцца за кулісы, цікавяцца, як выглядае грымёрка, першымі імкнуцца прайсці тэатральныя квэсты і абавязкова пасля наведвання тэатра посцяць сэлфі з выканаўцамі ў сацсетках. А чацвёртыя ўсё жыццё мараць выйсці на сцэну, таму лёгка ідуць на кантакт з акцёрамі і гатовыя выканаць невялікую ролю ў прапанаваных абставінах.

ЧАТЫРЫ ШЛЯХІ ДА РАЗВЯЗКІ

Таму мы прапануем гледачам розныя віды білетаў: чым актыўней хтосьці хацеў бы ўдзельнічаць у спектаклі, тым вышэйшая за гэта цана. У выніку ўсе хоць і будуць прысутнічаць на адным і тым жа спектаклі, але пабачаць яго па-рознаму.

Набыўшы адзін з прапанаваных відаў білетаў, публіка аўтаматычна падзеліцца на чатыры групы, кожная з якіх выправіцца ў сваю тэатральную вандроўку: гледачы будуць хадзіць з адной пляцоўкі на другую, блукаць па закуліссі, адпачываць ва ўнутраным дворыку Дома літаратараў, на сцэне якога мы месцімся з дня заснавання нашага тэатра. Кожную з груп будзе суправаджаць канкрэтны чалавек, каб ніхто не заблытаўся ў пляцоўках.

Адначасова на шматлікіх лакацыях будуць знаходзіцца каля 30 артыстаў. Шоу-спектакль прадугледжвае яднанне прафесіяналаў розных жанраў.

> **"Мы вельмі шмат працуем, каб у чалавека з'явілася адчуванне, што ён знаходзіцца ўнутры прасторы, якая перайначваецца наўпрост у залежнасці менавіта ад яго дзеянняў і свядомага выбару.**

Прынамсі, у нас у пастаноўцы, акрамя ўласна акцёраў, задзейнічаны каскадзёры, ілюзіяністы, мімы, вакалісты. Яны будуць разыгрываць свае ролі і прапаноўваць гледачам выбіраць, у які бок рушыць далей сюжэт, уцягваць у квэсты. Упэўнена, публіцы не толькі спадабаецца чаканне развязкі пакручастага містычнага трылера: яна атрымае задавальненне ад гульні ў тэатр. Мы вельмі шмат працуем, каб у чалавека з'явілася адчуванне, што ён знаходзіцца ўнутры прасторы, якая перайначваецца наўпрост у залежнасці менавіта ад яго дзеянняў і свядомага выбару.

МЕЖЫ ДАЗВОЛЕНАГА

— Хоць спектакль імерсіўны, аднак класічныя асновы працы над пастаноўкай мы захоўвалі: пад ідэю быў адаптаваны тэкст, спачатку ў нас прайшоў перыяд чыткі, затым адбылося размеркаванне роляў. Усім надзвычай цікава паўдзельнічаць у праекце такой нязвыклай формы, таму людзі працуюць шчыра і самааддана!

Пазіцыянуем свой эксперымент як першае імерсіўнае шоу ў краіне. Пачынаць заўсёды боязна. А падобныя маштабныя праекты цягнуць да ўсяго шмат выдаткаў. Каб мець упэўненасць у фінансавым боку, тры спецыялісты нашага PR-аддзела папярэдне даследавалі гледацкі запыт, праводзілі аналіз, плацежаздольнасць розных катэгорый грамадзян.

Творчая каманда спектакля аналізавала магчымыя рэакцыі гледачоў. Ведаю, што падчас імерсіўных паказаў тэатры зрэдку, але ўсё ж сутыкаюцца з сітуацыяй, калі хтосьці з прысутных нечакана выходзіць за межы дазволенага — кране артыстаў, праяўляе агрэсію ў дачыненні да іх і гэтак далей. Канешне, фармат вельмі складаны, бо адсутнасць адлегласці сама па сабе правакуе кантакт, які можа быць больш шчыльным, чым хацелася б. Таму мы шмат увагі надаем працы з акцёрамі ў гэтым кірунку: абыгрываем падобныя сітуацыі, шукаем мірныя шляхі вырашэння магчымых канфліктаў. Але першапачаткова імкнёмся не ставіць артыстаў у рызыкоўныя сітуацыі. Па маім меркаванні, у гэтым і заключаецца прафесіяналізм каманды, якая робіць імерсіўны спектакль: гледачы адчуваюць і поўнае занурэнне ў пастаноўку, але ўсё ж адчуваюць і мяжу, якую немагчыма перайсці.

Для большай яснасці мы паўсюль публікуем правілы існавання на такім тэатральным прадстаўленні. Яшчэ пры продажы білетаў кожнаму дадаткова тлумачыцца, што на спектаклі публіку чакае іншая рэальнасць, але з жорстка прапісанымі законамі, у тым ліку — правіламі паводзін. Перад пачаткам спектакля гледачам зноў нагадваюць пра тое, што можна рабіць, а што нельга.

"Д'ябл і сеньярыта Прым" — спектакль клубнага фармату, што прадугледжвае для гледачоў (на афішы мы пазначаем узроставы цэнз — ад 18 гадоў) магчымасць набыць бакал віна. Калі з-за гэтага хтосьці забудзецца на межы прыстойнасці, мы пакідаем за сабой права яго акуратна вывесці з пляцоўкі — для гэтага ў нас ёсць дамова з прафесійнымі ахоўнікамі.

Аднак спадзяюся, што ўсе гэтыя моманты застануцца ўсяго тэорыяй, бо мы стваралі спектакль для разумных людзей. Для тых, хто шукае шляхі для ўнутранай самарэалізацыі і ў гэтым атрымлівае задавальненне. Мы разлічваем пабачыць на нашым шоу інтэлектуальную публіку.

СПРОБЫ НЯЗВЕДАНАГА

— Імерсіўны спектакль узнік у нас невыпадкова, бо з моманту заснавання тэатра мне хацелася бачыць на сцэне не толькі драматычныя спектаклі ў традыцыйным разуменні гэтага вызначэння. Наша афіша даволі разнастайная. Напрыклад, колькі ўжо гадоў праводзім маладзёжны тэатральны форум "Моц жыцця". У гэтым сацыяльным праекце для школьнікаў, які падтрымліваецца Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама і прысвечаны праблемам наркаманіі, мы ўпершыню паспрабавалі пазбавіцца ўмоўнай сцяны, што падзяляе публіку і акцёраў, каб выйсці да рэальнай размовы з аўдыторыяй. Тут нават нельга сказаць "гледачы": праз пяць хвілін яны ўцягваюцца ў тэатральнае дзейства. З моладдзю ідзе размова на роўных, каб усе прысутныя змаглі адчуць, што сапраўды не існуе межаў паміж людзьмі рознага ўзросту ці сацыяльнага становішча. Тады дыялог атрымліваецца, а гэта і для нас саміх дае надзвычай карысны досвед.

У рэпертуары ёсць і спектаклі для дзяцей — прыгожыя, чуллівыя пастаноўкі. Нямала камедый, бо я лічу смех сапраўды карысным, ён дапамагае жыць, змагацца, рушыць уверх. І ўсё ж імкнуся падбіраць матэрыял, каб можна было не толькі парагатаць, але і паплакаць — смех без іншых перажыванняў пусты. А на Нацыянальную тэатральную прэмію намініраваны наш спектакль "Вераніка жадае памерці" паводле таго ж Паўла Каэльё — пра пошук апор у жыцці, калі ўжо здаецца, што ўсё бессэнсоўна.

Падаецца, што ў сваім новым спектаклі мы рызыкуем. Але ці не рызыка ўвогуле для прыватнага калектыву кожны чарговы праект? Калі я стварала наш тэатр, то першая пастаноўка таксама была творчай авантурай. Для яе мы ўвогуле многае прыносілі самі з дому. Мінулыя з таго часу дзевяць гадоў паказалі, што крок быў правільным.

Камерны драматычны тэатр ствараўся для зносін. Паглядзіце: людзі сталі радзей хадзіць адзін да аднаго ў госці, заседжвацца за размовамі на кухнях. А кухня — гэта што? Утульнасць і давер, бо сюды ты запросіш толькі таго чалавека, у якім ты цалкам упэўнены. Мы імкнёмся будаваць менавіта такі тэатр — з цёплай атмасферай, без адлегласцяў, з поўным даверам паміж гледачамі і артыстамі.

К

Віцебская мадонна

2 лістапада споўнілася 125 гадоў з дня нараджэння Веры Ермалаевай

Канец верасня 1937 года. Аральскае мора. На старую баржу грузяць вялікую групу зняволеных. Праз некаторы час судна прычальвае да пясчанага незаселенага вострава. Зняволеных высаджваюць на бераг. Баржа сыходзіць у зваротны шлях. Людзі ж застаюцца на востраве без ежы і пітва. Усе яны асуджаны на пакутніцкую смерць. Як мяркуюць некаторыя даследчыкі, сярод гэтай групы смяротнікаў была і мастачка Вера Ермалаева. Гэта яе Марк Шагал назваў Віцебскай мадонай. Гэта яна разам з Казімірам Малевічам стварыла ў Віцебску знакамітае аб'яднанне УНОВИС. Гэта яна была апошнім рэктарам Віцебскага мастацка-прамысловага інстытута і зрабіла ў ім адзіны выпуск студэнтаў.

1922 год. УНОВИС. Стаяць (злева направа): Іван Чарвінка, Казімір Малевіч, Яфім Рояк, Ганна Каган, Мікалай Суецін, Леў Юдзін, Яўгенія Магарыл. Сядзяць (злева направа): Міхаіл Векслер, Вера Ермалаева, Ілля Чашнік, Лазар Хідзекель.

ДАЧКА БАРАНЭСЫ

Нарадзілася Вера Ермалаева 2 лістапада 1893 года ў сяле Ключы Пятроўскага павета Саратаўскай губерні. Бацька яе быў памешчыкам і займаў пасаду старшыні земскай павятовай управы. Маці мела тытул баранэсы Унгерн-Унікоўскай. У дзяцінстве Вера ўпала з каня, вынікам чаго стаў параліч ног — у далейшым дзяўчына магла перасоўвацца толькі з дапамогай мыліц. Але гэта не перашкодзіла Ермалаевай атрымаць выдатную адукацыю ў Парыжы, Лазане, Санкт-Пецярбургу.

Ермалаеву з дзяцінства цягнула да мастацтва, і ў 1911 годзе яна паступіла ў студыю жывапісца Міхаіла Бернштэйна. Там Вера зацікавілася кубізмам і футурызмам, што потым адбілася на яе творчасці.

Атрымаўшы мастацкую падрыхтоўку, Ермалаева пачынае займацца кніжнай ілюстрацыяй. Яна супрацоўнічае з арцеллю "Сегодня", якая выпускала невялікімі тыражамі лубкі і кнігі-карцінкі, афармляла выданні арцеляў "Мышата", "Петух" і "Пионеры". Ілюстрацыі рабіліся пры дапамозе гравюр на лінолеуме і затым у большасці выпадкаў расфарбоўваліся ўручную.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Ермалаева ўдзельнічала ў конкурсах Наркамасветы, працавала як мастак тэатра, стварыла эскізы да знакамітай футурыстычнай оперы Міхаіла Мацюшына і Аляксея Кручоных "Перамога над сонцам".

ПАРЫЖ НА ДЗВІНЕ

Існуе такі прыгожы выраз, што ў пачатку 1920-х гадоў Віцебск на некаторы час стаў беларускім Парыжам. Тады ў гэтым невялікім правінцыйным горадзе стварыліся ўнікальныя ўмовы для развіцця мастацкіх з'яваў сусветнага маштабу. Тут дзейнічала вышэйшая мастацкая навучальная ўстанова, у якой развіваліся навейшыя на той час эстэтычныя ідэі, у тым ліку зараджаўся дызайн сучаснага тыпу, быў адкрыты адзіны ў савецкай краіне музей сучаснага мастацтва, нарэшце, працавала нават філармонія.

Пачалося ж усё ў 1918 годзе, калі ў Віцебску было арганізавана Народнае мастацкае вучылішча. Маладому дырэктару Марку Шагалу былі патрэбныя выкладчыкі, якія б падзялялі яго мастацкія погляды. На старонках газеты "Искусство коммуны" ён апублікаваў зварот да мастакоў з заклікам падтрымаць новаствораную навучальную ўстанову. Заклік Шагала не застаўся без водгуку. У Віцебск пачалі прыязджаць вядомыя мастакі, у асноўным з Масквы і Петраграда. У іх ліку была і Вера Ермалаева.

У Беларусь яна прыехала ў ліку першых "эмісараў" — яшчэ ў 1919 годзе. Неўзабаве стала кіраваць жывапіснай майстэрняй у Народным мастацкім вучылішчы, потым увайшла ў яго прэзідыум. А ўжо на наступны год — пасля таго, як Шагал прыняў рашэнне пакінуць Віцебск — заняла яго месца дырэктара.

Работа ў навучальнай установе па-ранейшаму вялася наватарскімі метадамі. Практыкавалася рознаўзроўневае выкладанне — ад асновы выяўленчага мастацтва і да навуковага аддзялення (нешта накшталт аспірантуры). Па заканчэнні курса студэнт, акрамя выканання жывапісных ці практычных заданняў, павінен быў напісаць і тэарэтычную работу.

Якія задачы ставілі перад сабой педагогі той навучальнай установы, відаць з дакументаў, што дайшлі да нашага часу: маладой дзяржаве патрэбны спецыялісты, якія б маглі стварыць сучасны рэчыўны свет, у якім бы дамы, масты, аэрапланы, прадметы побыту не толькі характарызаваліся тэхнічнай дасканаласцю, але і былі б свайго кшталту творамі мастацтва.

Ермалаева была бліжэйшай паплечніцай найбольш радыкальнага з выкладчыкаў — Казіміра Малевіча. Яны ўдвох сталі заснавальнікамі аб'яднання УНОВИС — "Утвердители нового искусства". Менавіта яно высунула патрабаванне "вытворчасці праектаў новых форм утылітарных патрэбнасцяў і рэалізацыі іх у жыцці". І ўжо неўзабаве ў дзейнасці членаў праявіліся парасткі таго, што мы сёння называем прамысловым дызайнам.

Вялікія планы, вялікія надзеі... Здаецца, наперадзе шмат цікавага, значнага, але неўзабаве ў навучальнай установы (на той момант яна ўжо мела назву Мастацка-практычны інстытут) пачынаюцца праблемы, звязаныя і з матэрыяльнымі, і з ідэалагічнымі прычынамі: у новага мастацтва знайшлося нямала праціўнікаў. У выніку яго "утвердители" пачалі пакідаць Віцебск. У 1922 годзе з'ехаў і Малевіч.









Ермалаева засталася самнасам з усімі цяжкасцямі, якія наваліліся на Мастацка-практычны інстытут: недахоп грашовых сродкаў, нападкі ворагаў новага мастацтва. Тым не меней, яна не здавалася. У маі 1922 года пад яе кіраўніцтвам адбыўся першы і адзіны выпуск. Дыплом аб заканчэнні інстытута атрымалі 11 чалавек, 17 студэнтаў перавялі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Масквы і Петраграда.

Што цікава, у гады свайго рэктарства Ермалаева актыўна прыцягвала да працы ў інстытуце студэнтаў-старшакурснікаў. Так, навучэнцы Міхаіл Векслер, Ніна Коган, Саламон Юдовін кіравалі вучэбнымі майстэрнямі, а Іван Гаўрыс з восені 1921 года нават быў намеснікам Ермалаевай.

Яна рабіла ўсё магчымае, каб захаваць Віцебскі мастацка-практычны інстытут. Але ўжо было зразумела, што ён асуджаны на знікненне. Усвядоміўшы гэта, Ермалаева ў жніўні 1922 года ад'язжае ў Петраград. А 1923 год становіцца для інстытута апошнім.

"ЗА АНТЫСАВЕЦКУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ"

У Петраградзе Ермалаева атрымала пасаду кіраўніка лабараторыі колеру ў Дзяржаўным інстытуце мастацкай культуры, заснаваным яе старым паплечнікам Казімірам Малевічам. Але ў 1926 годзе яго таксама ліквідавалі. Супраць новага мастацтва пачаліся рэпрэсіі.

Ермалаева зарабляла сабе на жыццё супрацоўніцтвам з часопісамі "Воробей", "Новый Робинзон", "Чиж" и "Ёж", працавала як жывапісец і графік, ілюстравала дзіцячыя кнігі. У 1929 годзе разам з мастакамі Уладзімірам Сцерлігавым, Канстанцінам Раждзественскім, Львом Юдзіным, Мікалаем Суеціным, Ганнай Лепорскай стварыла "групу жывапісна-пластычнага рэалізму". На кватэры Ермалаевай праходзілі творчыя "аўторкі" гэтых мастакоў і выставы, якія суправаджаліся абмеркаваннямі. Гэта ўсё стала падставай для даносу нейкага "дабразычліўца".

25 снежня 1934 года Веру Ермалаеву арыштавалі адначасова з некаторымі іншымі членамі гуртка. 29 марта 1935 года яна была асуджана на тры гады турэмнага зняволення — "за антысавецкую дзейнасць, якая выяўлялася ў прапагандзе антысавецкіх ідэй і спробе арганізаваць вакол сябе антысавецкі настроеную інтэлігенцыю". Адбывала пакаранне ў Карагандзінскім лагеры. У верасні 1937 года Ермалаева была асуджана паўторна і прыгаворана ўжо да вышэйшай меры. Пра апошнія дні яе жыцця дакладнай інфармацыі няма. Нехта з даследчыкаў сцвярджае, што мастачку расстралялі, нехта пераказвае гісторыю пра пакутніцкую смерць на пясчанай выспе.

У Віцебску Вера Ермалаева правяла ўсяго тры гады. Але ж той час быў надзвычай важным для гісторыі горада. І не апошнюю ролю ў гэтым сыграла менавіта яна — бясстрашная амазонка новага мастацтва.

Якаў ЛЕНСУ,
кандыдат мастацтвазнаўства

Народны па прызванні

Да 75-годдзя з дня нараджэння народнага артыста Беларусі Яўгена Шыпілы



Даўно ўжо няма з намі Яўгена Патафеевіча, як няма і многіх іншых выдатных майстроў коласаўскай сцэны. І толькі памяць разпораз абуджае з нябыту тыя незабыўныя спектаклі, у якіх яны здзіўлялі і радавалі гледачоў.

НАРЭШЦЕ ЯМУ ПАШАНЦАВАЛА!

У 1967 годзе Беларускі дзяржаўны тэатр імя Якуба Коласа аб'явіў набор у акцёрскі дапаможны склад. Сярод прагных да святла рампы маладзёнаў, якія адгукнуліся на абвестку, быў і Жэня Шыпіла.

Ён з'явіўся на свет 7 кастрычніка 1943 года ў вёсцы Відокі, што на Верхнядзвіншчыне. За плячыма ў 24-гадовага юнака была камсамольская работа, вучоба на курсах культасветработнікаў у Мінску, праца інструктарам раённага Дома культуры — і неаднаразовыя няўдалыя спробы паступлення ў тэатральна-мастацкі інстытут.

А вось кіраўніцтву Коласаўскага тэатра і яго вядучым артыстам Яўген прыйшоўся даспадобы. Ён цудоўна выконваў беларускія вершы і байкі, быў файным апавядальнікам. Апрача таго, валодаў вельмі натуральным маўленнем — той чыстай, не літаратурнай, а менавіта народнай гаворкай, якой немагчыма навучыцца, бо яе можна хіба ўвабраць разам з малаком маці. І хлопца залічылі!

ГЕРОІ-АДНАГОДКІ

Ужо ў першых эпізадычных ролях малады артыст папраўдзе пераўвасабляўся ў сваіх персанажаў — хай сабе і другарадных ды не надта прывабных. Напрыклад, у Кузьму Хаценьчыка з камедыі "Амністыя" Мікалая Матукоўскага, які спрабуе ўва што б там ні стала абараніць свайго прыяцеля-сабутэльніка, нахабна хітруе, маніць, маскіруецца.

Памежнік Пятро Шчарбіна з драмы "Не турбуйся, мама!" Надара Думбадзе — роля таксама не з галоўных, але гэты хлопец таксама запомніўся сваім акрэсленым характарам, які гартуецца ў тых варунках, калі выпрабоўваюцца мужнасць і адданасць радзіме.

Неяк непрыкметна артыст разам з яшчэ адным самародкам Леанідам Трушко перайшоў у асноўны склад трупы, у яе маладзёжнае ядро. Часцей за ўсё яму на той час даручалі сыграць тых персанажаў, якія і па ўзросце былі яго аднагодкамі: Пётр Хромаў з п'есы "Сталявары" Генадзя Бокарава, Іван Швед з "Таблеткі пад язык" Андрэя Макаёнка, Генадзь з камедыі "Укралі кодэкс" Алеся Петрашкевіча.

СТАЛЕННЕ І "СТАРЭННЕ"

Творчы пік для Яўгена Шыпілы наступае з прыходам у тэатр Валерыя Мазынскага. Яшчэ маладому на той час акцёру пачынаюць даручаць ролі іншага кшталту — узроставыя. Найперш тут прыгадваецца дзед Курыла з драматычнай балады "Сымон-музыка". Як дакладна і па-мастацку пераканаўча Шыпіла даваў гледачу зразумець, што некалі і гэты стары меў талент музыкі, забіты ў ім потым суровай рэчаіснасцю! Працавіты і мудры чалавек перадаваў свой досвед Сымону — і сам вучыўся ад юнака бачыць хараство прыроды і шчырых чалавечых памкненняў.

Нямала сыграў акцёр на коласаўскай сцэне розных старых (Глахуна ў "Законе вечнасці" Надара Думбадзе, пенсіянер Тарон з армянскай камедыі "Заставайцеся сонцам" Арамашота Папаяна, Мульцік-Фядос з "Вечара" Аляксея Дударава). І ў кожным з гэтых герояў ён знаходзіў і знешнюю, і ўнутраную своеасаблівасць, чалавечую непаўторнасць.

У ЗОРНЫ ЧАС

На пачатку 1980-х бясспрэчным поспехам карысталіся пастаноўкі "Парог" і "Вечар" па п'есах Аляксея Дударава. У першай з іх артыст сыграў цэнтральную ролю Андрэя Буслая. Без перабольшання заўважым, што гэта быў творчы пік артыста, яго зорны час. Прыблізна тады і я пазнаёміўся з ім. Прычым пазнаёміўся выпадкова — падчас аднаго з выязных спектакляў у вёсцы, дзе я тады жыў і працаваў.

Яўген Патафеевіч запрасіў мяне на прэм'еру "Парога". На тым спектаклі яго шчырая, пранікнёная ігра выклікала авацыі. Памятаю, я, тады яшчэ малады хлопец, быў моцна ўражаны. Ды і ён сам не стрымліваў хвалявання: было відаць, наколькі глыбока ён занурыўся ў матэрыял. Шыпіла паказаў цяжкі, драматычны шлях адраджэння чалавека, абуджэнне знявечанай душы. Трэба адзначыць, часам ён захапляўся, фарсавымі, сцэнічна выйгрышнымі аспектамі ролі. Але ў фінале ўражваў глыбінёй перажыванняў, сапраўдным драматызмам.

У спектаклі "Вечар" акцёр пераконваў мудрасцю, унутраным спакоем, справядлівасцю свайго героя. Здаецца, ён не адчуваў стомленасці цяжару пражытых гадоў. Нават калі Мульцік-Фядос размаўляў з Ганнай альбо Гастрытам, яго рукі прывычна рабілі што-небудзь. Праца і адносіны да яе — гэта аснова яго чалавечых прынцыпаў і адносін да іншых людзей. Узнікала адчуванне, быццам ягоны герой прыйшоў з самаго жыцця — настолькі артыст быў праўдзівы і дакладны.

МАРЫ ЗДЗЕЙСНЕНЫЯ І НЯЗДЗЕЙСНЕНЫЯ

У вымаўленні тэксту, манерах паводзін, у карыстанні рэквізітам Шыпіла ўмеў паказаць народнае паходжанне сваіх персанажаў. Гэта асабліва ярка адчувалася ў яго рабоце над вобразам Несцеркі, якога яму давялося сыграць пасля народных артыстаў СССР Аляксандра Ільінскага і Фёдара Шмакава. Пра гэтую ролю ён марыў доўгія гады, вывучыў тэкст на памяць і на адным з выязных спектакляў, калі другі выканаўца захварэў, увайшоў у спектакль без аніводнай рэпетыцыі.

Хочацца ўзгадаць і яшчэ пра адну мару артыста, але няздзейсненую. Ён прагнуў сыграць Тараса са знакамітай паэмы "Тарас на Парнасе". На жаль, спектакль паводле гэтага твора з'явіўся ў рэпертуары тэатра ўжо пасля заўчаснай смерці Шыпілы.

АД ШЭКСПІРА ДА "ЧАЛАВЕКА З НАРОДА"

Яўген Патафеевіч стварыў цэлую галерэю персанажаў у класічных творах. Гэта паштмайстар Шпекін у "Рэвізоры" — чалавек, які жыве быццам не ў гэтым свеце, тым самым сцвярджаючы яго абсурднасць, дзядзька Ваня, што занадта позна ўсвядоміў марнасць сваіх намаганняў і страчанага жыцця, апантаны прагай улады бунтаўшчык Джон Бочка ў "Генры VI" і няшчасны пакутнік Глостэр у "Каралі Ліры".

Але найбольш блізкія і душы артыста, і яго тыпажным дадзеным, і яго менталітэту былі персанажы народныя. Напрыклад, такія, як праўдашукальнік, бясрэбранік Ягор Палушкін у інсцэніроўцы аповесці Барыса Васільева "Не страляйце ў белых лебедзяў" (спектакль, на жаль, нядоўга пратрымаўся ў рэпертуары, але на тых, хто яго бачыў, зрабіў незабыўнае ўражанне). Або як сват Канкаліс — таленавіты вясковы эпікурэец-балагур у легендарным "Клеменсе" Казіса Саі. Або невялічкая роля інваліда Ягоравіча ў спектаклі "Адпачынак пасля ранення" паводле аповесці Вячаслава Кандрацьева — персанажа, які, нягледзячы на сваё гаротнае становішча, умее добра прыстасавацца да складаных ваенных умоў.

Хачу яшчэ адзначыць, што чалавекам гэты вядомы артыст быў шчырым і вельмі адкрытым. Памятаю, як часцяком мы з ім падоўгу стаялі на прыпынку і размаўлялі пра тэатр, пра тыя сцэнічныя вобразы, якія ён увасабляў на коласаўскай сцэне.

НЕ ТОЛЬКІ ТЭАТР

Яўген Шыпіла здымаўся і ў кіно. Прычым гэта былі не толькі эпізадычныя, але і цэнтральныя ролі ў стужках "Новая зямля" паводле Якуба Коласа, дзе ён сыграў дзядзьку Антося, і "Адна ноч" паводле апавядання Васіля Быкава, дзе акцёр стварыў драматычны, унутрана супярэчлівы вобраз Івана Валокі, які вымушаны раздзірацца паміж спагадай і пачуццём доўга.

■■■

28 лістапада 1999 года Яўгена Шыпілы не стала. Памёр ён усяго ў 56 гадоў у вёсцы Свяціцы Верхнядзвінскага раёна, там і пахаваны. На магіле пастаўлены сціплы помнік-напамін пра тое, што жыў на Беларусі з 1943 па 1999 год вясёлы чалавек, знакаміты артыст, які вельмі любіў сваю малую радзіму.

Юрый ІВАНОЎСКІ,
літаратурны рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, тэатразнаўца
Фота з архіва тэатра



У ролі Несцеркі ("Несцерка").



Мульцік ("Вечар").



Джон Бочка ("Генры VI").

Буслай ("Парог").

Пётр Хромаў ("Сталявары").

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выстава **"Сусвет Язэпа Драздовіча"** — да 30 снежня.
■ Выстава **"Фотавобразы і матэрыялы: японская гравюра 1970-х гадоў"** — да 25 лістапада.
■ Выстава **"Памяці Мінскага гета"** — да 10 снежня.
■ Выстава **"Юнацтва камсамольскае"** — да 25 лістапада.
■ Выстава графікі Яўгена Куліка **"Душой адданы Беларусі"** — да 2 снежня.
■ Выстава твораў Рыгора Сітніцы **"Ток"** (графіка, жывапіс) — да 9 снежня.
■ Выстава **"Латвіі — 100. Гісторыя, мастацтва, традыцыі"** — з 16 лістапада да 13 студзеня 2019-га.
■ Выстава **"Час цішыні"** (са збору Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь — з 15 лістапада да 15 снежня.
■ Выстава **"Мара"** (Deaf-art: жывапіс глухіх) — да 9 снежня.

Філіялы музея
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск,
вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы",
Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў альбо саломапляценні (на выбар) — кожную нядзелю. Пачатак а 12-й.
■ Выстава **"Народны строй — жывая традыцыя"** — да 24 лістапада.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
■ Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
Выставы:
■ Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"**.
■ Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава **"Мастацтва Шакаладу"** — да 8 студзеня 2019-га.
■ Выстава **"Па той бок жыцця: нямецкая акупацыя ў графіцы Меера Аксельрода"** — да 12 лістапада.
■ Выстава **"Знакі Незалежнасці. Польскія грошы 1915 — 1939"** — да 30 лістапада.
■ Выстава **"1918. Нараджэнне новага свету"** (ў рамках аўтарскага праекта Уладзіміра Ліхадзедава "У пошуках страчанага") — з 14 лістапада да 2 снежня.

Філіялы музея
ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
■ Абноўленая экспазіцыя **"Гісторыя сацыял-дэмакратычнага руху канца XIX — пачатку XX стст."**
■ Выстава **"Пырхаючыя кветкі"** — да 2 снежня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 11.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Сучасная гісторыя Рэспублікі Беларусь: 1991 — 2017 гг."**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 06 33.
Экспазіцыі:
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Выстава **"Шчыгел — птушка 2018 года"** — да 31 снежня.
г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").
Тэл.: +37529 123 60 53.
■ Атракцыён **"Стужачны лабірынт"**.
■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
■ Выстава **"У чаканні Гадо. 50 год"** — з 12 да 30 лістапада.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава вінтажнай музычнай апаратуры з калекцыі Алега Цёмкіна **"Ад грамафона да смартфона"** — да 2 снежня.
Майстар-класы:
■ Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя беларускага кінематографа"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя **"Памяці Мінскага гета"** — да 2 снежня.
■ Часовая экспазіцыя **"Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал дзвюх армій"**— да 18 лістапада.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выставачны праект **"Шматгранны свет красак"** з калекцыі сучаснага мастака Марыны Лапа — да 15 лютага 2019-га.
■ Выстава **"Чвэрць стагоддзя"**, прысвечаная юбілею Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж".
■ Гістарычны квэст "Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў". Па папярэдніх заяўках.
Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Персанальная выстава Мікалая Хомчыка **"Восеньскі дывертысмент"** — да 15 лістапада.
Ратуша
Вул. Савецкая, 3.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Музейны праект **"Нясвіж — горад майстроў"**. Па папярэдніх заяўках.
■ Квэст **"Выхадкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі"**.
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
■ Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя"**.
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар…", "Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак", "Капрызы моды ракако"**.
■ Квэст **"Белы слон"**.
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
■ Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
■ Музейная фотапляцоўка.
■ Выстава Гедэрта Эліяса **"Мае жыццё — жывапіс"** — да 30 лістапада.
■ Фотавыстава Аляксандра Ласмінскага **"Сэрца зямлі маёй"** — да 31 студзеня 2019-га.
■ Выстава **"VECTOR. Праз стагоддзі да сучаснасці"** — да 11 снежня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
■ Часовая экспазіцыя Анатоля Александровіча **"Родныя вобразы"** — да 19 лістапада.
■ Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
■ Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
■ Музейныя майстар-класы і заняткі.
■ Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
■ Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.
■ Выстава **"Рускі еўрапеец Іван Тургенеў"** — да 30 лістапада.
■ Выставачны праект **"Маладая Беларусь. Асоба і творчасць Янкі Купалы ў гісторыі краіны"**, прысвечаны 100-годдзю абвяшчэння БССР — з 12 лістапада да 12 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска
ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганаваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава **"Музы ў страі"** — да 18 лістапада.
■ Выстава **"Румынія: 100 фотаздымкаў да 100-годдзя Вялікага Аб'яднання"** — да 11 лістапада.
■ Выстава мастакоў дынастыі Шапо (Уладзімір, Аляксандр, Павел і Антон) **"Струста, Даўбле, Рычы, Саванар"** — з 15 лістапада да 16 снежня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
Выставачныя праекты:
■ "Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".
■ "Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі".
■ "Археалагічныя артэфакты ў XII — XIX стст."

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.
■ **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.
■ Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8-2.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава твораў Аксаны Хамко **"Выбранае"** — да 11 лістапада.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.
■ Пастаянная экспазіцыя.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).
Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзем пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белсаюздрук"	кіёскі "Белсаюздрук"
Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".	**ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".	**Праспект Пераможцаў, 5.**
Праспект Незалежнасці, 44.	**Вуліца Рабкораўская, 17.**
Вуліца Валадарскага, 16.	**Праспект Незалежнасці, 68, В.**
	Вуліца Лабанка, 2.

ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41
альбо пішыце на электронны адрас
kultura@tut.by!

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Выстава твораў мастака-педагога Наталлі Жыгамонт **"Спрадвечнае"** — з 14 да 25 лістапада.
■ Выстава **"Вечнасць і момант. 1918 — 1939 — Польшча моцная архітэктурай"** — да 12 лістапада.
■ Выстава **"Дзень за днём"** — да 12 лістапада.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ Спецыялізаваная выстава **"Фотакрафт"** — да 12 лістапада.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
■ **10 — "Вяселле Фігаро"** (опера ў 4-х дзеях) В.А.Моцарта.
■ **11 — "Спартак"** (балет у 3-х дзеях) А.Хачатурана. Пачатак а 18-й.
■ **13 — "Травіята"** (опера ў 4-х дзеях) Дж.Вердзі.
■ **13 — Канцэрт "Ад оперы да раманса".** Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.
■ **14 — Канцэрт "Шэдэўры харавой оперная музыкі"**.
■ **15 — "Маленькі прынц"** (балет у 2-х дзеях) Я.Глебава.
■ **16 — "Чароўная флейта"** (опера ў 2-х дзеях) В.А.Моцарта.
■ **17 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60.
■ **10 — "А мне не соромна!.."** (больш, чым казка) Л.Усцінава. Пачатак аб 11-й.
■ **11 — "Кар'ера доктара Рауса"** (гістарычна недакладная трагікамедыя) В.Марціновіча.
■ **13 — "Бетон"** (візуальная паэзія) Я.Карняга.
■ **14 — "Пакуты ад здаровага сэнсу"** (камічная прыпавесць) С.Рубэ.
■ **15 — "Гэта ўсё яна"** (драма) А.Іванова.
■ **16 — "Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменка.
■ **17 — "Воўк-мараплавец"** (музычная казка) С.Казлова. Пачатак аб 11-й.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **10 — "Кветачка-вясёлка"** (музычная казка ў 2-х дзеях) В.Катаева.
■ **11 — "Піліпка і Ведзьма"** (казка для дзяцей ад 5 гадоў) С.Кавалёва.
■ **17 — "Казкі пра казку"** (паводле твораў беларускай мастачкі Ганны Сілівончык). Прэм'ера. Пачатак спектакляў аб 11-й.